РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 КРАСАВІКА 2025 г. АЎТОРАК № 68 (30456)

# ПАМЯЦЬ СЭРЦА

## Тое, што нікога не пакіне раўнадушным

Сярод мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю Вялікай Перамогі, гэта, бадай, адно з самых адметных. Фактычна серыя канцэртаў-рэквіемаў «Кожны трэці», прысвечаных памяці герояў і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, якая пачалася 6 красавіка ў Палацы Рэспублікі, гэтыя асноўныя мерапрыемствы і адкрывае. Канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» нясе асноўную сэнсавую нагрузку — важна памятаць усіх, хто загінуў у гады вайны і дзякуючы каму была здабыта Перамога. У Беларусі няма сям'і, якую б не закранула тая вайна, таму на канцэрце не можа быць раўнадушных. У гэтым мы пераканаліся ў першы ж дзень, паглядзеўшы яго разам з прадстаўнікамі Брэсцкай вобласці. Канцэрт-рэквіем на працягу гэтага тыдня ўбачаць дэлегацыі з усіх рэгіёнаў. У тым, што пачалі з Брэстчыны, таксама закладзены сэнс: у Беларусь вайна прыйшла менавіта з гэтага напрамку, і продкі гэтых людзей першымі сутыкнуліся з усімі жахамі таго часу.

СТАР. 8–9

Фота Лізаветы ГОЛАД і БелТА.

МОДУЛЬНЫЯ ФАПы НА БРЭСТЧЫНЕ 6

ЯКОЕ СВЯТЛО ТРЭБА РАСАДЗЕ 14

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

ВАРТА ВЕДАЦЬ

# ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ ВАДЗІЦЕЛЯЎ І ПЕШАХОДАЎ

## Што новага ў экзаменах «на правы» і правілах карыстання СПМ

Красавік прынёс не толькі часовае пахаладанне, але і даволі істотныя змены для аўтааматараў і карыстальнікаў арэндных электрасамакатаў. Так, з улікам павелічэння іх колькасці ў сталіцы і папулярнасці кікшэрынгавых сэрвісаў уносіцца шэраг змяненняў у іх дзейнасць.

Яшчэ адно слушнае новаўвядзенне — змяніўся парадак здачы кваліфікацыйнага экзамену на атрыманне вадзіцельскага пасведчання. Як адзначылі ў ДАІ, усе змены зроблены на падставе грунтоўнага аналізу і накіраваны на аптымізацыю і ўдасканаленне гэтай працэдуры, а ў выніку — на бяспеку дарожнага руху.

*Падрабязнасці — у матэрыялах нашых карэспандэнтаў.* СТАР. 7, 11

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЗЯРЖАЎНЫ ПРЫЯРЫТЭТ

25 красавіка 2024 года Рашэннем Усебеларускага народнага сходу № 5 была прынята Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі. Яе палажэнні ахоплівалі ўсе галіны жыццядзейнасці нашай дзяржавы. Мінуў год, і на пасяджэнні Савета бяспекі 3 красавіка 2025 года быў разгледжаны даклад аб стане нацыянальнай бяспекі і мерах па яе ўмацаванні.

Задача захавання міру — прыярытэт для нашай дзяржавы і аснова беларускай палітыкі. Мы заўсёды адкрытыя для раўнапраўнага дыялогу і традыцыйна выступаем донарамі бяспекі ў еўрапейскім рэгіёне.

Разам з тым кіраўніцтва Еўрасаюза і краіны — суседзі Беларусі імкнуцца — размаўляць з намі з пазіцыі сілы, узмацняючы жорсткасць санкцыйнага ціску і грэбуючы нормамі міжнароднага права. Паблізу нашых граніц разгортваюцца ўдарныя групоўкі і сучасныя сродкі паражэння, удасканальваецца інфраструктура і ствараюцца ваенныя вытворчасці, праводзяцца дзясяткі вучэнняў і гучыць мілітарысцкая рыторыка. Менавіта таму мы вымушаны ўдзяляць самую пільную ўвагу пытанням бяспекі.

Адкрываючы пасяджэнне, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Нам трэба будзе разгледзець вынікі праведзенай работы, стан нацыянальнай бяспекі ў мінулым 2024 годзе і, што самае важнае, меры па ўмацаванні нацыянальнай бяспекі. Нагадаю, парадак ацэнкі быў скарэкціраваны. Гэта знайшло адлюстраванне ў адпаведным указе. З улікам дынамікі абстаноўкі, зацверджаных прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця ўдакладнены былі і індыкатары, іх парогавыя значэнні, суб'екты гэтага працэсу і іншыя пытанні».

Змяненні, унесеныя ў стратэгічныя дакументы краіны, і рэальная геапалітычная абстаноўка запатрабавалі дэталёвага разгляду стану спраў у кожнай з дзевяці сфер нацыянальнай бяспекі (палітычнай, эканамічнай, навукова-тэхналагічнай, сацыяльнай, дэмаграфічнай, біялагічнай, інфармацыйнай, ваеннай, экалагічнай). Невыпадкова акрамя пастаянных членаў Савета бяспекі на мерапрыемстве прысутнічалі службовыя асобы, якія непасрэдна адказваюць за канкрэтныя галіны функцыянавання дзяржавы, ажыццяўляюць маніторынг дынамікі па кожным з кірункаў.

**Варта нагадаць, што, згодна з існуючымі падыходамі, асноўнымі індыкатарамі стану нацыянальнай бяспекі выступаюць:**
**— доля валавога назапашвання асноўнага капіталу;**
**— ступень уліку нормаў міжнароднага права і прадугледжаных у ім палітыка-прававых механізмаў у вырашэнні пытанняў, якія закранаюць інтарэсы суб'ектаў міжнародных адносін;**
**— наяўнасць і эфектыўнасць міжнародных прававых і палітыка-прававых гарантый бяспекі і суверэнітэту Беларусі;**
**— узровень даверу інстытутам дзяржаўнай улады;**
**— унутраныя выдаткі на навуковыя даследаванні і распрацоўкі;**
**— узровень развіцця інфармацыйных тэхналогій і тэлекамунікацый;**
**— стан ваенна-палітычнага становішча;**
**— гатоўнасць ваеннай арганізацыі дзяржавы да выканання задач па забеспячэнні ваеннай бяспекі;**
**— узровень ваеннай моцы дзяржавы і шэраг іншых.**

Па сутнасці, яны ахопліваюць усе сферы жыццядзейнасці дзяржавы і яе грамадскіх інстытутаў, грунтуюцца на выніках глыбокай навуковай прапрацоўкі і абагульнены ў адзінай сістэме індыкатараў (паказчыкаў). У выніку ўвазе членаў Савета бяспекі краіны прадстаўлена дакладная карціна працэсаў, якія адбываюцца ў краіне і за яе межамі, апісаная дакладнай мовай матэматыкі і фармалізаваная ў выглядзе выніковага дакумента. Гэта дае магчымасць даць аб'ектыўную ацэнку рэальнай абстаноўкі, ажыццявіць аналіз бягучай сітуацыі і спрагназаваць дынаміку яе развіцця, выпрацаваць практычныя крокі па аператыўным і перспектыўным рэагаванні.

За рамкамі асвятлення застаюцца: абмеркаванне, удакладненне, прапановы, пастаноўка задач, паколькі гэта непублічная частка работы Савета бяспекі. Нам жа, беларускім грамадзянам, трэба ўсвядоміць адно: бяспека краіны і грамадства — дзяржаўны прыярытэт, які заўсёды пад кантролем Прэзідэнта і ваенна-палітычнага кіраўніцтва краіны.

На фоне беспрэцэдэнтнага павелічэння ваенных бюджэтаў еўрапейскімі дзяржавамі да велічынь 2—5 працэнтаў ВУП, мілітарызацыі іх эканомікі Беларусь не ўцягваецца ў новую гонку ўзбраенняў, не раздзімае траты на абарону, а паслядоўна рэалізоўвае курс на ўдасканаленне аператыўнага і інжынернага абсталявання тэрыторыі, якасць падрыхтоўкі ваеннаслужачых і часцей (падраздзяленняў).

Акрамя таго, негатыўныя тэндэнцыі ў ваеннай сферы нівеліруюцца за кошт асіметрычных крокаў, сярод якіх рэалізаванае ў 2024 годзе размяшчэнне на беларускай тэрыторыі тактычнай ядзернай зброі і яе носьбітаў, распрацоўка перспектыўных айчынных сродкаў паражэння і абароны, рэалізацыя планаў па пастаноўцы на баявое дзяжурства расійскай сістэмы «Арэшнік».

**Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава, у якой чалавек — галоўнае багацце. Менавіта сацыяльная сфера забяспечвае падтрымку народам палітычнага курсу краіны, а гэта рэальна, калі выконваюцца гарантыі: расце ўзровень заработнай платы, паляпшаюцца ўмовы працы, будуецца жыллё, удасканальваецца ахова здароўя.**
**Любое павелічэнне выдаткаў на абарону цягне за сабой скарачэнне сацыяльнай сферы, што наглядна дэманструе сучасная Еўропа. Францыя, ФРГ, Вялікабрытанія, Польшча, Літва, Латвія і іншыя краіны ЕС, каб дагадзіць палітычным установкам, руйнуюць уласнае насельніцтва, прыкрываючыся «пагрозай з усходу». Гэта не наш шлях, пра што сведчаць вынікі дзейнасці Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь.**

Невыпадкова нацыянальная бяспека дзяржавы разглядаецца ў комплексе па ўсіх дзевяці сферах з улікам іх узаемасувязяў і асаблівасцяў. Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Аляксандр Вальфовіч зазначыў: «У цэлым абстаноўка ацэньваецца станоўча». Гэта датычыцца большасці сфер жыццядзейнасці краіны, уключаючы новы кірунак — біялагічную бяспеку, якая «мае стабільныя паказчыкі па ўсіх пяці індыкатарах нацыянальнай бяспекі і не выклікае апасенняў».

**Разам з тым не выклікае сумневу, што расслабляцца нельга. Бо ёсць кірункі, якія носяць аб'ектыўна дэструктыўны характар, і гэта ў першую чаргу «знешнепалітычная абстаноўка з тэндэнцыямі да абвастрэння», якая абумоўлівае санкцыі, накіраваныя супраць нашай эканомікі. Аднак Беларусь устойліва развіваецца, ідзе наперад, забяспечваючы макраэканамічную збалансаванасць і дастойны ўзровень жыцця людзей.**

Сёння ў беларускім грамадстве існуе рэальны запыт на бяспеку і стабільнасць. Падзеі ў многіх кутках свету і ў нашым уласным доме сведчаць, як лёгка іх страціць і якіх неймаверных намаганняў варта іх захаваць.

У год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Беларусь чарговы раз нагадвае ўсім дзяржавам, што ні да каго не мае прэтэнзій, гатова з усімі выбудоўваць мірны і раўнапраўны дыялог, але не пацерпіць сілавога дыктату. Нацыянальная бяспека застаецца дзяржаўным прыярытэтам, а яе забеспячэнне — стратэгічнай задачай, для вырашэння якой у нас ёсць усё неабходнае.

**Мікалай БУЗІН, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук, прафесар.**

# БЯСПЕКА — А яе забеспячэнне — стратэгічная задача

**Даслоўна**

## Зрабіць так, каб патэнцыяльныя выклікі не ўзнікалі

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшыня Беларускага таварыства «Веды» Вадзім Гігін,** каментуючы ў эфіры «Альфа-радыё» пасяджэнне Савета бяспекі, заўважыў, што значная частка пасяджэння прайшла ў закрытым рэжыме, але па асобных сігналах было зразумела: фокус — як зрабіць такім чынам, каб мы працавалі на апярэджанне, гэта значыць, абмяркоўваліся не контрзахады, а меры па ўмацаванні бяспекі.

— Вось у чым розніца. Акцэнт быў не на тым, што, маўляў, мы бачым выклікі і пагрозы і што зробім, каб іх прадухіліць, а на тым, як зрабіць так, каб выклікі патэнцыяльныя не ўзнікалі, — падкрэсліў Вадзім Гігін. — А ў Савет бяспекі ў нас уваходзяць не толькі ваенныя, але і розныя органы ўлады — спікеры парламента, кіраўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта. Таму тут размова таксама ішла аб тым, каб у кожнай сферы прыняты неабходныя меры, зроблены крокі па далейшым умацаванні.

Вадзім Гігін звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі ў палітычнай сферы за чатыры гады праведзена каласальная работа. Цяпер, як адзначыў ён, мы ўступаем у самы працяглы ў гісторыі Беларусі міжэлектаральны перыяд:

— Калі глядзець па законе, у нас наступныя выбары будуць толькі ў 2029 годзе. Ніколі паміж выбарчымі кампаніямі такога разрыву не было. Але гэта не азначае, што павінна быць самазаспакоенасць. Павінна абмяркоўвацца, як будзе працаваць дэпутацкі корпус, якія крокі будуць зроблены ў грамадзянскай супольнасці, якія прававыя меры, што неабходна зрабіць.

Вадзім Гігін падкрэсліў, што такія пытанні будуць абмяркоўвацца і ў эканамічнай, і ў ваеннай сферы:

— Мы рыхтуемся да УНС. На 5 гадоў будзе праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця. І там размова не аб контрмерах, а аб тым, каб узмацніць беларускую эканоміку такім чынам, каб забяспечыць устойлівыя тэмпы росту на апярэджанне. Калі казаць пра ваенную сферу, то за апошні год мы зрабілі такія асіметрычныя крокі па ўмацаванні бяспекі, якія пры мінімальнай затраце фінансавых сродкаў і без правядзення нейкай дадатковай мабілізацыі дазволілі Беларусі ўпэўнена забяспечваць абарону сваіх меж, правоў і свабод грамадзян, нашых нацыянальных інтарэсаў на гады наперад. Таму падобная работа будзе ажыццяўляцца ва ўсіх сферах жыцця грамадства.



ІНТЭГРАЦЫЯ

# ДАРОЖНАЯ КАРТА СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА

## Прэм'ер-міністр Беларусі падчас афіцыйнага візіту ў Маскву правёў перагаворы са сваім расійскім калегам

Аляксандр ТУРЧЫН у Маскве на перагаворах з прэм'ер-міністрам Расіі Міхаілам МІШУСЦІНЫМ заявіў аб прыярытэтнасці і доўгатэрміновасці беларуска-расійскага стратэгічнага партнёрства, перадае БелТА.

Фота БелТА.

«Характэрнай асаблівасцю адносін, якія склаліся паміж нашымі краінамі і народамі, з'яўляецца тое, што свае першыя візіты пасля выбараў або пасля назначэння кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь традыцыйна ажыццяўляе менавіта ў Расійскую Федэрацыю. Гэта наглядна сведчыць аб прыярытэтнасці і доўгатэрміновасці беларуска-расійскага стратэгічнага партнёрства», — сказаў Аляксандр Турчын.

Ён нагадаў, што мінулы год быў азнаменаваны важнымі вехамі для двухбаковых адносін Беларусі і Расіі: 25-годдзем падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы і 30-годдзем Дагавора аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Беларуссю і РФ. «Да гэтых юбілейных дат мы падышлі са значнымі вынікамі, што яшчэ раз пацвярджае правільнасць выбранай кіраўнікамі дзяржаў мадэлі Саюзнай дзяржавы, якая на сёння з'яўляецца адным з самых узорных прыкладаў эканамічнай інтэграцыі не толькі на постсавецкай прасторы, але і ва ўсім свеце. У сувязі з гэтым нацэлены на дакладнае выкананне асноўных напрамкаў рэалізацыі саюзнага дагавора на 2024—2026 гады. Гэтыя дакументы — наш арыенцір, дарожная карта для далейшай пабудовы Саюзнай дзяржавы», — падкрэсліў прэм'ер-міністр Беларусі.

> **Ён канстатаваў, што Расія для Беларусі — асноўны гандлёвы партнёр, а ў мінулым годзе былі дасягнуты рэкордныя паказчыкі ўзаемнага тавараабароту. Аляксандр Турчын дадаў, што перагаворы прэм'ер-міністраў дзвюх краін датычацца шырокага спектра пытанняў.**

Афіцыйны візіт прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра Турчына ў Маскву з'яўляецца яшчэ адным пацвярджэннем асаблівага характару адносін Беларусі і Расіі. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Расіі Міхаіл Мішусцін. «Важна, што з першым замежным візітам у якасці кіраўніка ўрада вы наведваеце Расійскую Федэрацыю», — сказаў Міхаіл Мішусцін, вітаючы беларускую дэлегацыю на чале з прэм'ер-міністрам.

Кіраўнік расійскага ўрада назваў афіцыйны візіт Аляксандра Турчына вельмі своечасовым. «13 сакавіка ў Маскве адбыліся перагаворы Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Дасягнуты стратэгічныя дамоўленасці аб нарошчванні ўзаемадзеяння ў Саюзнай дзяржаве. І задача нашых урадаў — забяспечыць дакладнае і аператыўнае выкананне рашэнняў, якія прыняты на вышэйшым узроўні», — адзначыў ён.

Паводле слоў Міхаіла Мішусціна, прыярытэтная ўвага ўдзяляецца ўмацаванню двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «У мінулым годзе ўзаемны тавараабарот вырас на 6 працэнтаў адносна 2023 года і дасягнуў новых рэкордных паказчыкаў — гэта 4,5 трлн расійскіх рублёў, або амаль 163 млрд беларускіх рублёў», — прывёў ён даныя ў нацыянальных валютах.

«Нягледзячы на ўзмацненне незаконных санкцый у адносінах да Расіі і Беларусі, мы, абараняючы наш гандаль, інвестыцыі ўзаемныя, у тым ліку ад негатыўнай знешняй кан'юнктуры, практычна поўнасцю, больш як на 95 працэнтаў, перавялі фінансавыя разлікі ў нацыянальныя валюты. Паскараем таксама рэалізацыю сумесных кааперацыйных праектаў у галіне прамысловасці. Разам ствараем канкурэнтаздольныя прадукты ў першую чаргу з дабаўленай высокай вартасцю і ўмацоўваем тэхналагічныя прамысловыя суверэнітэты нашай Саюзнай дзяржавы. Прапрацоўваюцца і новыя ініцыятывы ў высокатэхналагічных галінах», — паведаміў Міхаіл Мішусцін.

Ён удакладніў, што размова ідзе аб штучным інтэлекце, лічбавых экасістэмах, выкарыстанні вялікіх даных, беспілотных аўтаматычных сістэмах. «Перакананы, што ўкараненне наогул лічбавых сэрвісаў, вядома, забяспечыць развіццё нацыянальных эканомік і значна павысіць якасць жыцця нашых людзей», — падкрэсліў прэм'ер-міністр РФ.

Міхаіл Мішусцін таксама канстатаваў, што бакамі асаблівая ўвага традыцыйна ўдзяляецца гуманітарнаму супрацоўніцтву. «У галіне культуры ў гэтым годзе ў Маскве пройдзе міжнародны музычны конкурс «Інтэрбачанне». Запрашаем, вядома ж, нашых беларускіх сяброў узяць у ім удзел», — дадаў ён.

«У маі мы адзначым 80-ю гадавіну Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта наша агульнае свяшчэннае свята. Мы шчыра яго шануем, беражліва захоўваем памяць аб подзвігу франтавікоў і працаўнікоў тылу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. І, вядома, перададзім яе будучым пакаленням грамадзян і Расіі, і Беларусі», — падкрэсліў Міхаіл Мішусцін.

У рамках візіту беларуская дэлегацыя наведала кампанію «Сбер Банк». Прэм'еру расказалі аб развіцці генератыўнага штучнага інтэлекту і магчымасцях вялікай моўнай мадэлі «Сбера» «GigaChat» для вырашэння розных задач у вобласці дзяржкіравання, бізнесу, медыцыны, бяспекі, адукацыі. Аляксандру Турчыну прадставілі інтэлектуальную платформу «Сбера» «X Threat Intelligence» для кіравання кіберпагрозамі, якая прадстаўляе экспертам па кібербяспецы, распрацоўшчыкам і адміністратарам IT-службаў актуальную інфармацыю аб пагрозах праз зручны інтэрфейс або API. Платформа дапамагае ўзмацніць абарону бізнесу.

Дэлегацыя азнаёмілася з дыстанцыйным маніторынгам ад медыцынскай кампаніі «СберЗдароўе», які рэалізоўваецца пры дапамозе «разумных» медыцынскіх прылад — танометра, стэтаскопа і камеры здароўя. Сёння база дыстанцыйнага маніторынгу пацыентаў з хранічнымі неінфекцыйнымі захворваннямі складае больш за 500 тысяч пацыентаў з 70 рэгіёнаў Расіі.

Прэзентаваны таксама флагманскі адукацыйны праект «Сбера» «Школа 21» — школа лічбавых тэхналогій, дзе кожны ахвотны, старэйшы за 18 гадоў, можа атрымаць запатрабаваную IT-прафесію. Сюды можна паступіць незалежна ад ведаў і досведу ў IT. Усе выпускнікі школы працаўладкаваны і паспяхова развіваюцца ў буйных кампаніях краіны. Праект актыўна маштабіруецца і прадстаўлены ў 15 гарадах Расіі.

ТЕХНОБАНК

**ОАО «Технобанк»**
220002, **Республика Беларусь**, **г. Минск**, **ул. Кропоткина**, 44.
**Телефон** +375 17 283 15 10

Форма 1

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 1 апреля 2025 года**

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Сим-вол | Пункт приме-чаний | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3.1 | 170 900 | 208 681 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 3.2 | 1 436 | 1 209 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3.3 | 126 128 | 143 220 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 3.4 | 298 616 | 318 642 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3.5 | 112 764 | 90 699 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3.6 | 526 313 | 474 125 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 3.7 | - | 2 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3.8 | 25 950 | 23 675 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 3.9 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 3.10 | 4 687 | 3 569 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 3.11 | 20 | 24 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 3.12 | 15 250 | 13 155 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **1 282 064** | **1 277 001** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 3.13 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 3.14 | 43 488 | 27 244 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 3.15 | 903 292 | 925 964 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 3.16 | 22 284 | 23 266 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3.17 | 49 878 | 46 195 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **1 018 942** | **1 022 669** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 3.18 | 4 630 | 4 630 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 29 132 | 23 132 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 3.19 | 11 270 | 10 397 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 3.20 | 218 090 | 216 173 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **263 122** | **254 332** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **1 282 064** | **1 277 001** |

Форма 2

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**на 1 апреля 2025 г.**

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Сим-вол | Пункт приме-чаний | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 26 007 | 17 004 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 11 573 | 7 257 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | **4.1** | **14 434** | **9 747** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 11 623 | 10 727 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 2 706 | 2 857 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **4.2** | **8 917** | **7 870** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4.3 | 63 | 83 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 4.4 | 390 | (53) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4.5 | 16 761 | 14 066 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4.6 | (5) | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4.7 | 8 521 | 3 035 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4.8 | 340 | 650 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4.9 | 21 512 | 17 647 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4.10 | 891 | 1 095 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 9 976 | 10 586 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 084 | 2 534 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **7 892** | **8 052** |

**Председатель Правления** **Д.Ю. Грузицкий**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

**Дата подписания: 01 апреля 2025 г.**

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта:
**https://tb.by/about/financial-indicators/**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 10.02.2025 г. УНП 100706562*

МІЖПАРЛАМЕНЦКІ ДЫЯЛОГ

# «ЗАПЫТ НА САЦЫЯЛЬНУЮ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ ВЫХОДЗІЦЬ НА ПЕРШЫ ПЛАН»

## Акцэнты візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі на чале з Наталляй КАЧАНАВАЙ ва Узбекістан

**Голас Беларусі гучаў падчас агульных дэбатаў 150-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза — найстарэйшай міжнароднай парламенцкай арганізацыі, якая налічвае ў сваім складзе больш за 180 дзяржаў. Беларуская дэлегацыя таксама ўзяла ўдзел у 4-й канферэнцыі Парламенцкай сеткі Руху недалучэння, якая лічыцца самай вялікай групай дзяржаў у свеце пасля ААН. Праграма візіту парламенцкай дэлегацыі Беларусі ва Узбекістан насычана двухбаковымі сустрэчамі. Ключавая — сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з Прэзідэнтам Рэспублікі Узбекістан Шаўкатам Мірзіёевым.**

Фота тг-канала Савета Рэспублікі.

Кіраўнік беларускай дэлегацыі перадала лідару Узбекістана шчырыя прывітанні і найлепшыя пажаданні ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. На сустрэчы былі разгледжаны пытанні далейшага пашырэння ўзбекска-беларускіх адносін. Падкрэслена важнасць прадаўжэння інтэнсіўнага міжпарламенцкага дыялогу, уключаючы забеспячэнне парламенцкага кантролю і садзейнічання своечасоваму выкананню дамоўленасцяў на вышэйшым узроўні.

### ДЗЕЛЯ РАЎНАПРАЎНАГА МІЖДЗЯРЖАЎНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Выступаючы ў ходзе агульных дэбатаў 150-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла ўнікальнасць гэтай пляцоўкі для разгляду актуальных пытанняў міжнароднага парадку дня. «Асамблеі ўдаецца захоўваць у сваёй рабоце прынцыпы раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага дыялогу, — канкрэтызавала яна. — Гэта ўмацоўвае ролю парламенцкай дыпламатыі ў пошуку адказаў на сучасныя выклікі і пагрозы, рэалізацыі стратэгій прагрэсіўнага развіцця дзяржаў з апорай на галоўны прынцып устойлівага развіцця — сацыяльную справядлівасць».

Спікер агучыла шэраг ініцыятыў і кірункаў для ўмацавання ўзаемадзеяння на міжнародным узроўні. Наталля Качанава выказала ўпэўненасць, што ва ўмовах крызісу міжнародных адносін парламентарыі павінны стаць актыўнымі абаронцамі сацыяльна-эканамічных правоў чалавека, садзейнічаць развіццю справядлівасці і салідарнасці, захаванню міру і спакою на міжнародным узроўні.

«Парламенты як архітэктары сацыяльнай палітыкі павінны актыўна прымаць законы, накіраваныя на абарону правоў грамадзян, забеспячэнне сацыяльнай роўнасці, стварэнне ўмоў для дастойнага ўзроўню жыцця, а таксама падтрымку ўразлівых слаёў насельніцтва і прасоўванне ўстойлівага развіцця грамадства», — падкрэсліла Наталля Качанава, адзначыўшы, што ў аснове дзяржаўнай палітыкі Беларусі заўсёды быў, ёсць і будзе чалавек.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што Беларусь была і застаецца міралюбівай краінай і ў міжнародных кантактах. «Беларускія парламентарыі прасоўваюць ідэі мірнага добрасуседства, раўнапраўнага і справядлівага міждзяржаўнага супрацоўніцтва, — падкрэсліла яна. — З гэтага пункту гледжання сацыяльнае развіццё і справядлівасць, дасягненне Мэт устойлівага развіцця патрабуюць глабальнага супрацоўніцтва. Парламенты павінны актыўна ўзаемадзейнічаць адзін з адным, абменьвацца вопытам і найлепшымі практыкамі, ствараючы сетку адзінства і салідарнасці».

На думку Старшыні Савета Рэспублікі, мэтазгодна максімальна аб'яднаць намаганні для абмеркавання і распрацоўкі сумесных ініцыятыў. «Стварэнне ў рамках Міжпарламенцкага саюза нефармальнага аб'яднання — Групы сяброў мірнага і стваральнага развіцця — магло б стаць новым вектарам парламенцкай сілы, парламенцкай дыпламатыі, у справе ўмацавання міжнароднага ўзаемаразумення, — лічыць спікер. — Пераарыентацыя сродкаў з мілітарызацыі на развіццё сацыяльнай палітыкі можа значна палепшыць якасць жыцця людзей і ўмацаваць стабільнасць грамадства. Замест укладанняў у зброю і ваенную інфраструктуру гэтыя рэсурсы трэба накіраваць на ключавыя кірункі сацыяльнай сферы: адукацыю, ахову здароўя, абарону мацярынства і дзяцінства, дзяржаўную падтрымку ўразлівых пластоў насельніцтва. Такі падыход здольны аб'яднаць міжнародную супольнасць вакол стваральных мэт і забяспечыць доўгатэрміновае развіццё, мір і бяспеку нашых краін».

### «БЕЛАРУСЬ ЗАЎСЁДЫ ПРЫТРЫМЛІВАЕЦЦА МІРАЛЮБІВАЙ ПАЛІТЫКІ»

Падчас выступлення на 4-й канферэнцыі Парламенцкай сеткі Руху недалучэння на тэму «Святкаванне 70-годдзя духу Бандунга: роля парламентаў у выкананні Бандунгскіх прынцыпаў», Наталля Качанава падкрэсліла, што сёння з упэўненасцю можна сказаць: Парламенцкая сетка Руху недалучэння з'яўляецца пляцоўкай для актыўнага развіцця супрацоўніцтва паміж парламентамі дзяржаў — удзельніц у мэтах выпрацоўкі сумесных падыходаў да вырашэння глабальных пытанняў і праблем.

Старшыня Савета Рэспублікі ўпэўнена: каб прынцыпы, закладзеныя ў дэкларацыі, прынятай 70 гадоў таму ў інданезійскім Бандунгу (фактычна канферэнцыя ў Бандунгу паклала пачатак Руху недалучэння), працягвалі існаваць і развівацца, неабходны кансалідаваныя намаганні ўсіх без выключэння дзяржаў — членаў руху. «Мы, парламентарыі, павінны быць глыбока ўцягнуты ў гэты працэс, — акцэнтавала ўвагу спікер. — Праз заканатворчую дзейнасць, стварэнне прававых норм і палітычных рамак парламенты забяспечваюць эканамічнае і сацыяльнае развіццё, захаванне суверэнітэту і незалежнасці сваіх дзяржаў».

Наталля Качанава падкрэсліла, што Беларусь заўсёды прытрымліваецца міралюбівай палітыкі, прынцыпаў раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага міждзяржаўнага дыялогу. «Наша парламенцкая дыпламатыя павінна быць накіравана на ўмацаванне салідарнасці паміж дзяржавамі і падтрымку ініцыятыў па ўстараненні дэструктыўных неакаланіяльных практык, на стварэнне механізмаў для заахвочвання мірных шляхоў вырашэння канфліктаў», — дадала спікер.

***

На палях 150-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза Наталля Качанава правяла сустрэчы са Старшынёй Меджліса Туркменістана Дуньягазель Гулманавай, Старшынёй Сената Пакістана Юсуфам Разой Гілані, Старшынёй Міжпарламенцкага саюза Туліяй Эксан, Старшынёй Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзілой Нарбаевай. Адбыліся перагаворы і ў фармаце «на нагах». Старшыня Савета Рэспублікі пагутарыла са спікерам Нацыянальнай народнай асамблеі Алжыра Ібрагімам Бугалі, Старшынёй Нацыянальнага сходу В'етнама Чан Тхань Манам, Старшынёй Мажыліса Парламента Рэспублікі Казахстан Ерланам Кашанавым. У ходзе сустрэч абмеркаваны асноўныя кірункі супрацоўніцтва і перспектывы яго развіцця, а таксама прыярытэтныя галіны ўзаемадзеяння, якія садзейнічаюць умацаванню сувязяў паміж краінамі і стварэнню спрыяльных умоў для сумесных праектаў і ініцыятыў.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# НЕ ФІЛАСОФСКІЯ РАЗВАГІ, А ВЫРАШЭННЕ КАНКРЭТНЫХ ПЫТАННЯЎ

## З якімі праблемамі падчас прыёму грамадзян людзі звярталіся да Ігара СЕРГЯЕНКІ

**Інфармацыя аб штомесячным правядзенні асабістага прыёму грамадзян спікерам у Палаце прадстаўнікоў загадзя размяшчаецца ў сродках масавай інфармацыі. Заяўнік павінен быць гатовы да таго, што ў ходзе папярэдняга запісу па тэлефоне ў яго папросяць удакладніць сутнасць пытання, з якім ён плануе звярнуцца да Ігара Сергяенкі. Гэта робіцца для таго, каб вызначыць кола спецыялістаў, якіх патрэбна будзе задзейнічаць падчас вырашэння таго ці іншага пытання. Дзякуючы папярэдняй рабоце, нярэдка нават на гэтым этапе здымаецца праблема, з якой чалавек змагаўся на працягу многіх гадоў.**

Фота БелТА.

### «ЗАЎСЁДЫ ЗНАХОДЗІЦЦА ВАРЫЯНТ ВЫРАШЭННЯ»

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Сужэнцы з Мінскага раёна звярнуліся да Старшыні Палаты прадстаўнікоў з просьбай аказаць садзейнічанне, звязанае з дазволам падключыцца да ліній электрапередачы сельгаспрадпрыемства ААТ «Ігнацічы». Гэта, па іх словах, дасць магчымасць падключыць у доме, дзе жыве сям'я, электраацяпленне.

«Звярталіся ў сельскі Савет, нам далі адмову, патлумачыўшы, што няма тэхнічнай магчымасці, — увёў у курс справы Аляксандр Фёдаравіч. — У гэты час прыслалі да нас брыгаду, якая абслугоўвае Мінскія электрасеткі. Спецыялісты патлумачылі, што забяспечыць наш дом электраэнергіяй не могуць, бо падстанцыя належыць ААТ «Ігнацічы». Звярнуліся і туды, дзе паведамілі, што ў прадпрыемства для гэтых мэт няма магутнасці».

Ігар Сяргянка праінфармаваў, што пытанне, з якім да яго звяртаецца сям'я, дастаткова спецыфічнае. «Каб разумець перспектыву газіфікацыі і электрыфікацыі краіны, мы ў Палаце прадстаўнікоў правялі вялікі семінар, на які запрашалі кіраўнікоў усіх структур гэтай галіны, энергетыкаў, газавікоў», — распавёў ён.

**Першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер філіяла Мінскія электрычныя сеткі РУП «Мінскэнерга» Аляксей МАРЦІНЧЫК,** які прысутнічаў на прыёме, праінфармаваў, што пытанне заяўнікаў будзе вырашана. Па яго словах, на цяперашні момант у падстанцыі сельгаспрадпрыемства ў сувязі з выездам шэрагу арандатараў з'явіліся рэзервы.

«Фактычна ў працэсе падрыхтоўкі да нашай сустрэчы мы ваша пытанне вырашылі, — рэзюмаваў Ігар Сергяенка. — Калі будуць пэўныя замінкі, прыходзьце да нас паўторна. Людзі звяртаюцца з такімі пытаннямі ў розных рэгіёнах, дзе я бываю, і заўсёды знаходзіцца варыянт вырашэння. Калі не адразу, то, з улікам тэхнічных магчымасцяў энергетыкаў, пазней».

### «ТЭМУ ВЫ ПАДНЯЛІ ЖЫЦЦЁВУЮ»

Звяртаючыся да спікера з асабістым пытаннем, жыхарка Стоўбцаў папрасіла заканадаўцаў паглядзець на яе праблему больш шырока. Па словах Зоі Мяфодзьеўны, у краіне адсутнічае нарматыўны прававы дакумент, які б рэгуляваў размяшчэнне расліннасці (дрэў, кустоў) уздоўж граніц сумежных зямельных участкаў.

Гэта пытанне для жанчыны востра паўстала, калі яна пераехала ў бацькоўскую хату ў Стоўбцы. Жанчына добраўпарадкавала ўчастак, паставіла сучасны плот, але спакойна жыць не даюць ёй дрэвы, якія растуць на суседнім участку. На яе плот пастаянна звісаюць галіны, у сезон участак засыпаны чужым ураджаем, больш за тое, сліўняк і іншыя дрэвы пускаюць свае парасткі ў яе агародзе. Прыбіраць гэта ўсё пажылой жанчыне, якая пражывае адна, ужо не дазваляе здароўе. Заяўніца звярталася ў мясцовыя органы ўлады. Адказ аб тым, што раённы выканкам не можа прымусіць землекарыстальніка спілаваць дрэвы, жанчыну не задавальняе.

«Тэму вы паднялі жыццёвую, — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мы на яе не проста звернем увагу, а прапрацуем змяненні. Цяпер мы вывучаем правапрымяняльную практыку: як рэалізоўваюцца палажэнні Кодэкса аб зямлі. Ужо паступіў шэраг прапаноў, у тым ліку ад нашых людзей, дэпутатаў. Будзем выходзіць на пэўныя змяненні». Дэпутату Стаўбцоўскай выбарчай акругі даручана ўзяць пытанне заяўніцы на кантроль.

Малады жыхар Шаркаўшчынскага раёна прыйшоў на прыём абмеркаваць са спікерам пытанні ўдзелу моладзі ў палітыцы. На яго думку, маладыя людзі не актыўна ўдзельнічаюць у палітычным жыцці краіны.

«У нас два дэпутаты як мінімум ва ўзросце да 31 года, — не пагадзіўся з маладым чалавекам Ігар Сергяенка. — Вы не маглі не звярнуць увагу і на апошнія прызначэнні. Кіраўнік дзяржавы заўсёды робіць акцэнт на амаладжэнні кадраў. Прыходзяць маладыя міністры, кіраўнікі на ўсіх узроўнях — усё гэта рэалізоўваецца. Гэта адзін з доказаў таго, што трэнд на маладзёжную палітыку ў нас ёсць».

Рэзюмуючы, Ігар Сергяенка адзначыў, што прапановы маладога чалавека заслугоўваюць увагі. «Але гэта ўсё ў асноўным філасофскія развагі, якія носяць ацэначны характар, — удакладніў ён. — Прымаючы грамадзян, я маю на мэце вырашаць канкрэтныя пастаўленыя пытанні: гаспадарчыя, заканадаўчыя, самыя розныя». На развітанне спікер запрасіў заяўніка на адну з сустрэч у сваёй выбарчай акрузе, дзе таксама будзе дадзена магчымасць абмеркаваць пэўныя пытанні: пры ўмове, што яны будуць прадметныя.

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Як расказаў у размове з журналістамі **начальнік галоўнага прававога ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ЧУПРАКОЎ,** пры запісе на прыём да Старшыні Палаты прадстаўнікоў улічваецца гісторыя разгляду гэтага пытання ў іншых інстанцыях. «У запісе на асабісты прыём адмаўляецца, калі дадзенае пытанне ўжо было прадметам разгляду ў судзе, а таксама калі заяўнік злоўжывае правам на зварот, — канкрэтызаваў ён. — Напрыклад, былі выпадкі, калі заяўнік больш як сто разоў звяртаўся ў розныя дзяржаўныя органы па адным і тым жа пытанні, з ім была спынена перапіска».

Аляксандр Чупракоў звярнуў увагу на тое, што для ўдзелу ў асабістым прыёме грамадзян па відэа-канферэнц-сувязі нярэдка прыцягваюцца кіраўнікі і службовыя асобы рэспубліканскіх і мясцовых органаў кіравання. «У асабістым прыёме, як правіла, прымае ўдзел дэпутат, які прадстаўляе адпаведную акругу, — дадаў ён. — Нярэдка разгляд пытання, узнятага на асабістым прыёме, ажыццяўляецца з выездам на месца для таго, каб больш дэталёва вывучыць сітуацыю і пагутарыць з жыхарамі, прадстаўнікамі мясцовых органаў. Такая сумесная работа дазволіла вырашыць шэраг узнятых грамадзянамі пытанняў. Напрыклад, яны датычацца арганізацыі дадатковых прыпыначных пунктаў, добраўпарадкавання тэрыторый, функцыянавання ўстаноў аховы здароўя, камунальных, інжынерных сетак».


Банк РРБ
на твоей скорости

**Закрытое акционерное общество «Банк роста и развития бизнеса»**
220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18
**www.rrb.by**

Форма 1

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
31 марта 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Сим-вол | 31.03.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 68 348 | 76 756 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 59 251 | 69 120 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 78 609 | 72 761 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 49 659 | 51 315 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 236 919 | 229 043 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 38 663 | 39 344 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 1 251 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 13 553 | 13 410 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 11 098 | 10 709 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 557 351 | 562 458 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 18 785 | 33 190 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 461 543 | 451 493 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 10 168 | 10 254 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 747 | 3 800 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 493 243 | 498 737 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 20 429 | 20 429 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 10 053 | 10 053 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 20 684 | 21 165 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 12 942 | 12 074 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 64 108 | 63 721 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 557 351 | 562 458 |

Форма 2

**ОТЧЕТ**
**о прибылях и убытках**
31 марта 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Сим-вол | 31.03.2025 | 31.03.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 8 699 | 5 019 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 8 082 | 3 718 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 617 | 1 301 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 907 | 2 741 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 520 | 496 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 387 | 2 245 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (16) | 12 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 5 772 | 3 384 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 34 | (266) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5 250 | 739 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 13 162 | 6 647 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 427 | 310 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 387 | 990 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | - | 184 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 387 | 806 |

Председатель Правления Д.И. Омельянчик

Главный бухгалтер Н.Н. Мостыко

Дата подписания: 2 апреля 2025 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 21 выдана 25 апреля 2024 года Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100361187.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Пресс-экструдер КМЗ-2У,** 1994 г. в. Месторасположение: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Булата, 1 | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 8 400,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после электронных торгов | |
| **Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) рабочих** дней с момента заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 8 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.03.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.04.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | |

**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении первых повторных публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ЧП «МБС-ТоргСервис»**
(УНП 191778882, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Лопатина, д. 7А, пом. 804).

***Дата и время проведения торгов*: 21 апреля 2025 года**.
Начало – 10.00. Заявки принимаются с 08 апреля 2025 года по 17 апреля 2025 года.
***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:*** **ЧП «МБС-ТоргСервис» (УНП 191778882), в лице председателя ликвидационной комиссии Миневич С.Г.**
Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.
Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте https://specrealization.by.
Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +3752968471 76.
Сведения о предыдущих торгах: РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 42 (30430) за 01.03.2025.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64)
по поручению **государственного учреждения «Клецкий территориальный центр социального обслуживания населения»** (222531, г. Клецк, ул. Толстого, 24)
проводит открытый аукцион
**по продаже автомобиля легкового специального вагон GAZ-2217 17 «Соболь»,**
**2014 г. в., рег. транзитный номер 5 НЕТ 7951, инвентарный номер 01530015, кузов (рама) VIN 221710E0558019, X96221717E0780911, цвет серый, находящегося по адресу: Минская область, г. Клецк, ул. Толстого, 24.**
**Начальная цена** (без НДС) – **8 550,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **855,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**
Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.
Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.
Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 04.01.2025, 18.02.2025.
Электронные торги состоятся **12.05.2025** в **10.00**.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.05.2025** до **17.00.**
**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра транспорта +375 29 553 12 83, время осмотра с 9.00 до 16.00 понедельник – пятница.**
УНН 690262440

14.04.2025 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».
Повестка дня:
1. О совершении сделок общества.
Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 08.04.2025 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
Дата сбора реестра акционеров – 07.04.2025 г.
Наблюдательный совет.
УНП 400022625

ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

# ХУТКА І ЭКАНАМІЧНА

## Тры модульныя ФАПы адкрылі ў Брэсцкай вобласці, на падыходзе — яшчэ чатыры

Не так даўно на ўрачыстае адкрыццё новага фельчарска-акушэрскага пункта сабралася ледзь не ўся вёска Зарэчка Драгічынскага раёна. Яно і зразумела. Увядзенне ў строй будынка вясковай медустановы важна для ўсіх, бо паспрыяе павышэнню якасці абслугоўвання кожнага пацыента, а таксама паляпшэнню ўмоў работы персаналу ФАПа.

На адкрыцці ФАПа ў Зарэчцы.

Фельчар Вольга Сідарэвіч.

Фота Дроічын.ВУ

### НАВАСЕЛЛЕ Ў ЗАРЭЧЦЫ

Павіншаваць з гэтай падзеяй вясковых жыхароў прыехала нямала гасцей. **Старшыня Драгічынскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір НЕРАД** нагадаў, што рамонтам і добраўпарадкаваннем аб'ектаў аховы здароўя ў раёне актыўна займаюцца ўжо некалькі гадоў. А ў Зарэчцы прынялі рашэнне замяніць былы прыстасаваны будынак на новы модульны ФАП. **Галоўны ўрач Драгічынскай раённай бальніцы Аляксандр ПРАТАСЕВІЧ** паведаміў, што на ўзвядзенне гэтага ФАПа пайшло 150 тысяч рублёў з абласнога бюджэту. Работу правялі спецыялісты прадпрыемства «Брэстжылбуд». Неабходнае абсталяванне закуплена на суму 14 тысяч рублёў са сродкаў раённага бюджэту. А яшчэ да добрай справы далучыліся спонсары. На набыццё мэблі, прыстасаванняў дапамогу аказалі СВК «Асавецкі», ААТ «Аляксеевічы-Агра», КСУП «Племянны завод Заказельскі». У іх адрас таксама прагучалі словы падзякі падчас адкрыцця.

Загадчае новым утульным ФАПам Вольга Сідарэвіч. Яна расказала карэспандэнту газеты, што ўмовы работы змяніліся да непазнавальнасці:

— У старым не было ніякіх выгод. Калі рукі памыеш у прыстасаваным умывальніку, то ваду трэба было выносіць. А цяпер на месцы ўсе зручнасці, ёсць халодная і гарачая вада. У памяшканні цёпла. І галоўнае, што ўся мэбля новая, новае абсталяванне. Проста прыемна працаваць. І людзі, што прыходзяць на прыём, адзначаюць прыгажосць і зручнасць новай установы.

Вольга Сідарэвіч — малады спецыяліст, на работу ў Зарэчку дзяўчына прыехала ў жніўні мінулага года па размеркаванні пасля заканчэння Пінскага медыцынскага каледжа. Расказала, што работа ёй падабаецца. Спраў, як у любога вясковага медыка, хапае. Да ФАПа прыпісана 570 жыхароў з трох вёсак. У іх ліку 79 дзяцей.

З 8 да 12 гадзін фельчар прымае пацыентаў у сваім кабінеце, а потым работа працягваецца ў форме абслугоўвання выклікаў, патранажу, медработнік наведвае пацыентаў па месцы жыхарства. Фельчарска-акушэрскі пункт адносіцца да Папінскай амбулаторыі ўрача агульнай практыкі. Раз на тыдзень па графіку прыём на ФАПе вядзе ўрач. Цяпер і доктару стала больш камфортна працаваць у новых умовах.

У размове з карэспандэнтам газеты старшыня Драгічынскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір Нерад сказаў, што людзі засталіся задаволены: «Падчас адкрыцця прагучала нямала ўдзячных слоў, асабліва ад пенсіянераў. Хораша выказаўся ветэран працы Віктар Грушко. Віктар Фёдаравіч сказаў аб тым, што чакаць прыёму з камфортам, нават зайсці ціск памераць у цёплым утульным памяшканні — гэта ўжо сведчанне клопату ўлады аб людзях».

### НОВАЕ СЛОВА Ў СПРАВЕ МЕДАБСЛУГОЎВАННЯ ВЯСКОЎЦАЎ

Модульныя ФАПы, несумненна, уяўляюць сабой новае слова ў справе медабслугоўвання вясковых жыхароў. Гэта бюджэтны праект у параўнанні з узвядзеннем капітальнай пабудовы і разам з тым магчымасць забяспечыць вёску кампактнай і зручнай медустановай. А кампактнасць мае яшчэ адну перавагу — ФАП можна размясціць у любым месцы, часцей іх устанаўліваюць у цэнтральнай частцы населеных пунктаў побач з гандлёвымі пунктамі, сацыяльнымі аб'ектамі.

Першая спроба рэалізацыі падобнага праекта на Брэстчыне была ажыццёўлена ў канцы мінулага года ў пасёлку Птушкафабрыка каля Кобрына. Менавіта там расказвалі аўтару гэтых радкоў аб перавагах такога будаўніцтва. У прыватнасці, як ужо было згадана, хуткасць і эканамічнасць. На загадзя падрыхтаваны падмурак ставяцца два модулі, якія нагадваюць вагончыкі. Затым падводзяцца вада, каналізацыя, электрычнасць. З асноўнай работай спецыялісты спраўляюцца звычайна за тыдзень-два. А далей ідуць унутраная аддзелка, добраўпарадкаванне, на якія таксама не патрабуецца шмат часу з-за невялікіх аб'ёмаў. І ўсё — ФАП гатовы, застаецца завезці абсталяванне, прыбраць ды можна пераразаць чырвоную стужку, як гэта зрабілі ў Зарэчцы.

Варта дадаць, што перад Зарэчкай новы модульны ФАП адкрылі ў Івацэвіцкім раёне. **Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый ГАРАГЛЯД** паведаміў, што ў гэтым годзе плануецца ўзвядзенне яшчэ чатырох тыпавых модульных фельчарска-акушэрскіх пунктаў у Іванаўскім, Баранавіцкім, Ганцавіцкім раёнах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

# ПАГАНЯЦЬ ЦЯПЕР НЕ АТРЫМАЕЦЦА...

## У Мінску зацвердзілі новыя правілы карыстання пракатнымі сродкамі персанальнай мабільнасці

Ужо каторы раз «Звязда» ўздымае надзённую і неадназначную тэму — электрасамакаты... Колькасць здарэнняў з удзелам сродкаў персанальнай мабільнасці працягвае расці ў разы, у тым ліку са смяротнымі зыходамі. У сувязі з гэтым рашэннем Мінскага гарвыканкама былі прыняты пэўныя меры, якія, магчыма, паспрыяюць рэгуляванню сітуацыі. Але ці атрымаецца ўсё ж «утаймаваць» гэтых самакатчыкаў і з якімі абмежаваннямі яны вымушаны цяпер звыкнуцца, абмеркавалі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

### «КАБ НАШЫ ГРАМАДЗЯНЕ МАГЛІ СПАКОЙНА ПРАХОДЗІЦЬ ПА ПЕШАХОДНЫХ ВУЛІЦАХ...»

У гэтым сезоне парк арэндных электрасамакатаў у Мінску будзе амаль удвая большы, чым два гады таму, расказала **намеснік старшыні камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Вольга ЛЯОШКА:** «З 2023 года мы рэалізоўваем пілотны праект. Было прынята рашэнне Мінгарвыканкама, якім вызначаны правілы карыстання сродкамі персанальнай мабільнасці на тэрыторыі Мінска. Мы пачыналі ў 2023 годзе рэалізоўваць гэты праект, калі парк самакатаў складаў каля 7-7,5 тысячы. У гэтым сезоне мы стартуем з 14,5 тысячы электрасамакатаў». Вольга Ляошка адзначыла, што пракат электрасамакатаў — гэта адзін з тых нешматлікіх бізнесаў, які не мае ценявога боку, таму што тут усё вельмі празрыста. Паводле яе слоў, карыстальнікі шэрынгавых сродкаў мабільнасці прывязваюць свае банкаўскія карты, такім чынам і ажыццяўляюць аплату.

Спецыяліст нагадала, што 19 сакавіка было праведзена выязное сумеснае пасяджэнне камісій Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў: «І сапраўды, дэпутаты як ніхто разумеюць гэту праблему. Для іх важна ўсё, што звязана з добраўпарадкаваннем, навядзеннем парадку ў горадзе. Тое, што мы зрабілі, і тое, што мы, спадзяюся, сёлета будзем рабіць, накіравана на бяспеку. З красавіка ў дзеючае рашэнне ўнесены змены. Напэўна, яны ўспрыняты аператарамі неадназначна, таму што сталі больш жорсткімі правілы карыстання сродкамі персанальнай мабільнасці. Але гэта было зроблена не проста так. Вельмі важна ўсё ж такі разумець, што культура кіравання залежыць ад саміх карыстальнікаў. Мы ўсе хочам, каб сталіца была прыкладам не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. У Расіі, напрыклад, ёсць гарады, дзе наогул забаранілі карыстанне электрасамакатамі, і нам не хацелася б, каб такое адбылося ў Мінску. Мы хочам, каб у нас быў парадак, каб нашы грамадзяне маглі спакойна праходзіць па пешаходных вуліцах і не баяцца, што могуць пацярпець. Акрамя таго, да нас прыязджае шмат гасцей з-за мяжы, практычна ўсе гуляюць у цэнтры горада, таму і былі прыняты пэўныя абмежаванні».

### АБМЕЖАВАННІ ХУТКАСЦІ Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД КАЛЬЦА

Прымаючы пад увагу актуальнасць кікшэрынгавых сэрвісаў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі сталіцы, а таксама павелічэнне колькасці ў вулічна-дарожнай сетцы горада арэндных СПМ, Мінскім гарвыканкамам прынята рашэнне аб унясенні змяненняў у парадак ажыццяўлення дзейнасці кікшэрынгавых сэрвісаў. Сутнасць змяненняў патлумачыў **намеснік начальніка УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Дзяніс ЛІВАНОВІЧ:** «Гэтым рашэннем прадугледжаны шэраг абмежаванняў, у тым ліку абмежаванне хуткасці руху арэндных сродкаў персанальнай мабільнасці, а таксама ўвядзенне забарон на здзяйсненне пэўных дзеянняў на асобных участках вулічна-дарожнай сеткі сталіцы. Уведзеныя забароны і абмежаванні закліканы знізіць колькасць ДТЗ з удзелам карыстальнікаў арэндных сродкаў мабільнасці і цяжар іх наступстваў, а таксама скараціць колькасць канфліктных сітуацый паміж уразлівымі ўдзельнікамі дарожнага руху. Асноўнымі зменамі з'яўляецца павелічэнне колькасці зон абмежавання для руху. Такімі зонамі сталі ўсе ўстановы адукацыі, некаторыя ўчасткі вулічна-дарожнай сеткі, паркі, скверы, станцыі метрапалітэна і іншыя знакавыя як у культурным плане, так і пры правядзенні масавых мерапрыемстваў тэрыторыі. Абмежаванні па гэтых зонах былі ўведзены па ініцыятыве адміністрацый раёнаў».

Наступныя змяненні, найбольш спрэчныя, — абмежаванні хуткасці. «Раней яна ў нас рэгулявалася хуткаснымі рэжымамі 15 кіламетраў за гадзіну ў межах першага транспартнага гарадскога кальца, 20 кіламетраў за гадзіну ў межах другога транспартнага гарадскога кальца, і ўжо на астатняй тэрыторыі ў межах МКАД хуткасць складала да 25 кіламетраў за гадзіну. Камерцыйнымі арганізацыямі гэтыя хуткасныя рэжымы былі адпрацаваны ў аўтаматызаваным рэжыме шляхам налад праграм на самакатах. Новым рашэннем Мінгарвыканкама прадугледжваюцца змены хуткасных рэжымаў па ўсіх гэтых зонах — 15, 17 і 20 кіламетраў за гадзіну адпаведна», — паведаміў Дзяніс Лівановіч.

Акрамя таго, ён анансаваў павелічэнне колькасці тых участкаў, на якіх існуе абмежаванне па максімальнай хуткасці да 7 кіламетраў за гадзіну. Дарэчы, пасля заканчэння мінулага сезона такіх участкаў было 47. Гэта аварыйна небяспечныя скрыжаванні, на якіх ужо адбываліся інцыдэнты як на шэрынгавых, так і на асабістых сродках персанальнай мабільнасці. «У асноўным гэта буйныя праспекты, якія маюць вялікую колькасць велапераездаў, пешаходных пераходаў і дзе сумесна ажыццяўляецца перасячэнне на дазваляльны сігнал святлафора транспарту і сродкаў персанальнай мабільнасці. У новым рашэнні такіх участкаў стане 200. Гэта не толькі буйныя праспекты, але і ціхія спальныя мікрараёны буйных жылых масіваў Маскоўскага, Фрунзенскага, Цэнтральнага, Першамайскага раёнаў. Участкі былі абраны па выніках аналізу аварыйнасці за апошнія тры гады з улікам інтэнсіўнасці руху транспартных сродкаў, веласіпедыстаў і іншых удзельнікаў дарожнага руху, дзе існуюць перадумовы да здзяйснення ДТЗ з цялеснымі пашкоджаннямі для саміх жа пешаходаў», — акцэнтаваў намеснік начальніка УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

Таксама ён падкрэсліў, што ўсе гэтыя меры былі выпрацаваны выключна па выніках аналізу аварыйнасці, дынаміка якой менавіта з удзелам сродкаў персанальнай мабільнасці значная. «Ёсць прыклады ДТЗ з удзелам шэрынгавых сродкаў персанальнай мабільнасці, якія былі здзейснены па іх віне. Напэўна, самым яркім з'яўляецца ДТЗ на скрыжаванні праспекта Машэрава і Даўмана, калі пры праездзе пешаходнага перахода на забараняльны сігнал святлафора пешаход на сродку персанальнай мабільнасці ў выніку сутыкнення з транспартным сродкам памёр на месцы здарэння. Згодна з вынікамі расследавання, па матэрыялах справы вінаватым прызнаны той самы пешаход, які атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні».

Дзяніс Лівановіч анансаваў і іншыя змены ў правілы карыстання СПМ, якія могуць адбыцца ў найбліжэйшы час: «Карыстальнікі сродкаў персанальнай мабільнасці павінны будуць спешвацца на пешаходных пераходах».

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


## Информация об ОАО «Витебсклес» и его деятельности за 2024 год

| 4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): | | 0 |
|---|---|---|
| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
| республиканская | | |
| коммунальная всего: | 0 | 0 |
| в том числе: | х | х |
| областная | | |
| районная | | |
| городская | | |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 1632 | 1632 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 9 | 9 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 1623 | 1623 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | | |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | | |
| Период, за который выплачивались дивиденды | первый квартал, полугодие, девять месяцев, год | | Х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | | Х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | | Х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 0,07 | 0,06 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | | |

| Акции, поступившие в распоряжение общества | | | Акции, приобретенные в целях сокращения общего количества | |
|---|---|---|---|---|
| Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, шт. | Срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, шт. |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

**7. Отдельные показатели деятельности открытого акционерного общества:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 18394,00 | 16308,00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 17908,00 | 15760,00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | -24,00 | -24,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 486,00 | 548,00 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -43,00 | 8,00 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -467,00 | -580,00 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | -24,00 | -24,00 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | -329,00 | -358,00 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | | |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 1987,00 | 2249,00 |

**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный год:** 13 марта 2025 года.
**Аудиторское заключение по бухгалтерской и (или) финансовой отчетности подготовлено:** 27 февраля 2025 года.
**Аудит проведен (наименование аудиторской организации (для индивидуального предпринимателя – фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется); местонахождение аудиторской организации (для индивидуального предпринимателя – место жительства); дата государственной регистрации, регистрационный номер в ЕГР.**
Общество с ограниченной ответственностью «Белросаудит», 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 89, к. 3, пом. 4. тел.: (+37517) 203-20-36, 203-17-02. Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 600506719 решением Мингорисполкома от 28.04.2000 г. № 465. УНП 600506719.
**Период, за который проводился аудит:** 2024 год.
**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской и (или) финансовой отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской и (или) финансовой отчетности – сведения о данных нарушениях:** Бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО»Витебсклес» на 31.12.2024 года, а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
**Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме:** 02.04.2025 года ЕПФР.
**13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета):** Применяются.
**14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет:** vitebskles.by

УНП 300029146

Статусбанк

**ОАО «СтатусБанк»**
www.stbank.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**31 марта 2025 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 81 399 | 89 158 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 62 322 | 25 691 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 81 213 | 119 412 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 115 852 | 119 407 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 8 190 | 8 231 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 1 699 | 4 005 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 350 675 | 365 904 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 8 787 | 3 027 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 233 261 | 265 074 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 15 539 | 3 836 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 257 587 | 271 937 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 48 000 | 48 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 14 885 | 14 885 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 141 | 142 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 30 062 | 30 940 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 93 088 | 93 967 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 350 675 | 365 904 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**за 1 квартал 2025 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 9 299 | 5 833 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 6 546 | 2 382 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 753 | 3 451 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 635 | 1 425 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 374 | 1 061 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 261 | 364 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 15 436 | 7 999 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 563 | 761 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 180 | 144 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7 192 | 5 947 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 184 | 228 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 11 691 | 5 022 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 2 569 | 1 402 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | 2 | 9 122 | 3 620 |

И. о. Председателя Правления

Главный бухгалтер

Дата подписания: 01 апреля 2025 г.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 выдана Национальным банком Республики Беларусь 20 февраля 2024 года. УНП 807000043.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПАМЯЦЬ СЭРЦА

## ЖУДАСНЫЯ ФАКТЫ ДАВЯДЗЕЦЦА АБНАЎЛЯЦЬ

Важнай асаблівасцю мерапрыемства стала тое, што ў канцэрт-рэквіем уплецены дакументальныя факты, у тым ліку атрыманыя па выніках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа.

— Ёсць новыя звесткі пра колькасць пахаванняў мірных жыхароў. Ужакланены даныя шакіруюць. Але іх важна данесціць да насельніцтва, і мы гэта робім праз наш праект, — адзначыла рэжысёр праекта — мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады Уладзіслава Арцюкоўская.

Паводле яе слоў, для будучых пакаленняў канцэрта-рэквіема факты, адлюстраваныя ў ім, верагодна, прыйдзецца яшчэ раз абнаўляць: новыя жахлівыя сведчанні злачынстваў фашыстаў і іх памагатых выкрываюцца штодзень.

— «Кожны трэці» — гэта не зусім канцэрт, хутчэй тэатральная пастаноўка, спецыяльна для якой створаны дэкарацыі. Задзейнічаны нават сцены Палаца Рэспублікі — дынамічныя праекцыі стваряюць неабходную атмасферу, складаюць дэкаратыўную аснову канцэрта. Мы не хацелі страціць гэту дэталізацыю, з якой так старанна працавалі аўтары, мастакі. Важны кожны прамень святла, кожны спецэфект. Нам хацелася ўсё гэта захаваць, — падзялілася Уладзіслава Арцюкоўская.

Упершыню канцэрт-рэквіем быў прадстаўлены гледачам 6 мая 2024 года ў Музеі Перамогі на Паклоннай гары ў Маскве, а таксама ў Мінску 22 чэрвеня, у Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. Цяпер у абноўленым і ўдасканаленым выглядзе яго паглядзяць жыхары ўсіх рэгіёнаў Беларусі і горада Мінска.

## РЭКВІЕМ ПА КОЖНЫМ

Па словах мансніка **старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзіма КРАЎЧУКА,** колькасны склад дэлегацыі ад рэгіёна склаў больш за 2,5 тысячы чалавек. Трэць з іх — моладзь.

— Такія праекты, як «Кожны трэці», дазваляюць выхоўваць новае пакаленне і нагадваць пра нашу гісторыю, перадаваць яе далей, — падзялілася ён.

Усяго ў Брэсцкай вобласці засталося 96 баявых ветэранаў Вялікай Айчыннай. Вадзім Краўчук падкрэсліў, што асноўная задача — дайсці да кожнага ветэрана разам з маладым пакаленнем, сказаць словы падзякі за мірнае неба над галавой.

Тэматычна канцэрт быў падзелены на дзве часткі. Першая прысвечана ахвярам вайны, менавіта там былі прадстаўлены ўнікальныя факты і хронікі. Лейтматывам другой часткі стала тэма адказнасці сучаснікаў за захаванне гістарычнай памяці. Гучалі як шырока вядомыя музычныя творы савецкага перыяду, так і новыя творы сучасных беларускіх аўтараў. Паэтычнай асновай канцэрта стаў «Рэквіем па кожным чацвёртым» А. Вярцінскага.

Кожны нумар праймаў да мурашак. Гэта быў уражальны сінтэз кранальнай музыкі, моцных галасоў, добра пастаўленых нумароў і ўнікальнага відэазасуправаджэння. Некалькі разоў уся зала ўставала ў знак павагі да памяці аб страшных падзеях тых гадоў. Выступіў перад гледачамі і іх зямляк Андрэй Цямчык з песняй «Да канца».

— Кампазіцыя вельмі цяжкая эмацыянальна. Яна пра маральна-валявыя якасці і пра тое, што ў любой сітуацыі, якой бы складанай яна ні была, трэба стаяць да канца і заставацца чалавекам, — падзяліўся ён.

## «СТРАШНА І БАЛЮЧА, ШТО ЎСЁ ГЭТА ПЕРАЖЫЛІ НАШЫ ПРОДКІ»

Канцэрт пакінуў у гледачоў няпростыя ўражанні. Прымусіў задумацца, успомніць расповеды бабуль і дзядуль пра тыя страшныя гады. Па словах **дырэктара Мілавідскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна Наталлі ГРЫЦАВЕЦ,** усё было вельмі кранальна і ўрачыста.

— Для мяне гэта асаблівы канцэрт: мая бабуля была калісьці малалетняй вязніцай фашысцкага канцлагера, таму ўсе кампазіцыі ўспрымаліся вельмі глыбока. Дзякуй вялікі арганізатарам і ўсім удзельнікам гэтага мерапрыемства, ніякі наклон усім ветэранам, якія адстаялі нашу родную зямлю, — сказала яна.

Перад канцэртам гледачы маглі акунуцца ў падзеі тых гадоў дзякуючы тэматычным выставачным праектам, якія размясціліся на розных узроўнях Палаца Рэспублікі. На думку **старшыні Відамлянскага сельсавета Камянецкага раёна Марыны КАРАЛЮК,** выстаўкі і канцэрт не могуць пакінуць абыякавым нікога.

— Мне ўсё гэта дорага і блізка. Выставачныя праекты настроілі на патрэбны лад перад канцэртам, які мяне вельмі моцна ўразіў. Мой дзядуля ваяваў, таму ўсе нумары знаходзілі водгук у сэрцы. Добра, што ёсць такія мерапрыемствы. Яны вельмі важныя для таго, каб людзі памяталі, як нам далася Перамога і мірнае жыццё, — падзяліласа яна.

Удалося нам пагутарыць і з прадстаўнікамі маладога пакалення, студэнтамі Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа.

— Насамрэч, я пад велізарным уражаннем: літаральна мурашкі па скуры. Кожны нумар быў па-свойму выдатны, узровень падрыхтоўкі ўражвае. Страшна і балюча, што ўсё гэта перажылі нашы продкі. Тым не менш мы павінны гэта памятаць і будзем гэта памятаць, каб такога больш не паўтарылася, — сказала **Марыя СІВАЛОЎСКАЯ.**

А **студэнту Уладзіміру БАТЦУ** гэта мерапрыемства нагадала па гісторыю яго ўласнай сям'і.

— Вельмі асабісты і кранальны канцэрт. У мяне прабабуля была партызанкай, перажыла фашысцкі палон. Яна шмат пра вайну расказвала, і гэту гісторыю нават надрукавалі ў мясцовай газеце. Мы захоўваем той артыкул як сямейную рэліквію, — падзяліўся ён.

Моцныя эмоцыі і яркія ўражанні засталіся ў прадстаўніко Брэсцкай вобласці пасля мерапрыемства. На чарзе — іншыя рэгіёны: серыя канцэртаў рэквіемаў і выставачных праектаў будзе праходзіць у Палацы Рэспублікі ажно да 12 красавіка.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

## Даслоўна

Учора на канцэрце-рэквіеме была дэлегацыя Віцебскай вобласці. **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** які выбіраўся дэпутатам ад Віцебшчыны, выказаў упэўненасць, што канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» не пакіне нікога абыякавым. Ён у думках перанясе ў грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны, якая пракацілася фактычна катком па кожнай беларускай сям'і. Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што і яго сваякі таксама бралі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне, шмат расказвалі пра той час. «Мой бацька прайшоў дарогамі вайны пачынаючы з 1943 года, вызваляючы Смаленшчыну, а затым Беларусь — Гродна, Магілёў, — падзяліўся ён. — Шмат расказваў аб тым часе, тых баях, тых выпрабаваннях. І якім быў Мінск».

У кожнай сям'і ёсць свая гісторыя, свае трагічныя старонкі, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, сказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. «Вайна ёсць вайна, яна не выбірае. Вядомыя гістарычныя факты, калі цэлыя сем'і сыходзілі на фронт. У Жодзіне стаіць помнік маці Купрыянавай, чые пяць сыноў не вярнуліся. Але ёсць факты, калі восем сыноў у Гомельскай вобласці вярнуліся з фронту жывымі і цэлымі. Вайна не выбірае».

Прадстаўлены ў калекцыі сельскагаспадарчай інтэлігенцы Цэнтральнага раёна, Гомельскай вобласці, на тэме калгаснай, саўгаснай, прамысловай, транспартнай, будаўнічай, медыцынскай, грамадскай, навуковай і іншай работы пад сенсарным расшырэннем Беларускай ССР

**Зварот**

Уключаемся ва ўсенароднае і ўсебеларускае сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года

**Узорна праваджаем веснавую сяўбу!**

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

**ЗВЯЗДА**

ОРГАН ЦК КПБ) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ**

64 (7390) НЯДЗЕЛЯ 8 красавіка 1945 г. Цана 20 кап.

### • На фронце

На працягу 7 красавіка ў палосе Карпат войскі 4-га Украінскага фронту з баямі занялі больш чым 30 населеных пунктаў, сярод якіх Брэнка, Малінка, Камешніца, Уйсолы, Розтакі, Гомбаш.

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, на паўночным усходзе і поўначы ад Браціславы войскі 2-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, занялі горад Нове Места і больш за 50 іншых населеных пунктаў, у тым ліку буйныя Кшына, Угровец, Чахціц, Брэзова, Глбоке, Сеніца, Чачоў. Гітлераўцы спрабавалі любой цаной утрымаць Нове Места ў сваіх руках. Яны спешна падцягнулі рэзервы і кінулі іх у бой. Аднак нашы войскі выбілі ворага з паночных нас мясцовасцю вышынь, а затым у выніку бою авалодалі гэтым важным вузлом шляхоў зносін.

У раёне Вены войскі 3-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, занялі гарады Медлінг, Прэсбаум, Клостэрнойбург. Такім чынам, франтавікі абышлі Вену



Ад Совецкага Інформбюро

не толькі з паўднёвага ўсходу і поўдня, але таксама і з захаду і паўночнага захаду. «Праціўнік упорна супраціўляецца, чапляецца за кожны рубеж, імкнучыся спыніць нашы наступаючыя часці. Побач з танкавымі і пяхотнымі дывізіямі немцы кідаюць у бой запасныя палкі, часці асобага назначэння, жандарскія атрады, курсантаў афіцэрскіх школ і другія падраздзяленні», — паведамляла «Звязда» зводку Савецкага інфармбюро.

Нашы войскі, адбіваючы вапрожыя контратакі і адкідаючы праціўніка, настойліва прасоўваліся наперад. Авалодаўшы прыгарадамі, савецкія штурмавыя групы вялі вулічныя баі ў паўднёвай частцы Вены. Быў заняты арсенал і іншыя апорныя пункты немцаў. На працягу дня было знішчана да трох тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. Савецкія лётчыкі знішчылі нямецкі браняпоезд і эшалон з боепрыпасамі.

Авіацыя Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту трапіла ў Данцыгскай бухце ў нямецкі эсмінец і транспарт водазмяшэннем у 5 тысяч тон. Апрача таго, былі пашкоджаны дзве быстраходныя дэсантныя баржы і адзін мінаносец праціўніка.

### • У тыле

Па-баявому рыхтаваўся да палявых работ калгас «Бальшавік» Чэрвеньскага раёна. Там ужо даўно было ачышчана насенне і завершаны рамонт сельскагаспадарчага інвентару.



ЗА СТО ПУДОЎ ЗБОЖЖА З ГЕКТАРА

«Асаблівую ўвагу звярнулі калгаснікі на падрыхтоўку цяглавай сілы. Лепшы конюх арцелі тав. Гаманюк старанным доглядам коней дабіўся таго, што ўсе яны маюць сярэднюю і вышэй—сярэднюю ўкормленасць», — пісала «Звязда».

Калгаснікі ў 1945 годзе, вывучаючы пастанову СНК СССР і ЦК ВКП (б) аб развіцці сельскай гаспадаркі і абмеркаваўшы ўсе магчымасці сельскагаспадарчай арцелі, вырашылі атрымаць 100 пудоў збожжавых і 150 цэнтнераў бульбы з гектара.

Каб забяспечыць такі ўраджай, яны вывезлі ў поле 300 тон гною, 600 тон торфу і сабралі 20 цэнтнераў попелу і птушынага памёту.

«Звязда» паведамляла, што па ініцыятыве звенавых С. Урбановіч і Н. Шут у калгасе была наладжана агратэхнічная вучоба: «Лекцыі ў агратэхнічным гуртку чытае калгасны аграном тав. Гаўруковіч», — паведамляла наша газета ў гэты дзень.

Завяршалася падрыхтоўка да сяўбы і ў арцелі «Чырвоны сцяг». Тут выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва за найлепшае правядзенне сяўбы калгас «Новыя дарогі». Два гэтыя калгасы абавязваліся закончыць сяўбу збожжавых за 8-9 дзён, бульбу пасадзіць за 10 дзён.

За найлепшае правядзенне веснавой сяўбы таксама спаборнічалі сельгасарцелі «Чырвоны партызан» і «Чырвоныя ляды».

Людзі далі слова працаваць ад чыстага сэрца, сеяць не абы-як, а сумленна, як раяць аграномы. З такім падыходам да справы, пэўна, усё ў іх атрымалася.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Вороновская сельхозтехника», Гродненская обл., Вороновский р-н, д. Бояры. УНП 500007686 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов (имущество реализуется одним лотом)**
Местоположение – **Гродненская обл., Вороновский р-н, Заболотский с/с, 2**

**Производственная база** в составе: **здание столяр. цеха** (454,8 кв. м, 421/С-1876), **здание мастерских** (1292,3 кв. м, 421/С-1879, составные части – заборы, ворота, проезжая часть, участки линий электропередач), **здание пункта технич. ухода** (412,4 кв. м, 421/С-1882), **здание проходной** (24,9 кв. м, 421/С-1881), **здание конторы** (233,7 кв. м, 421/С-1877), **склад газ. баллонов** (23 кв. м, 421/С-3185), **навес** (501,4 кв. м, 421/С-3184).
***Сведения о земельных участках***: предоставлены продавцу на праве постоянного пользования пл. **5,7861 га** для размещения объектов промышленности (ограничения (обременения) – охран. зоны линий электропередачи пл. 0,5000 га) и **0,0057 га** для обслуживания склада газ. баллонов.

**Начальная цена с НДС 20 % – 59 268,03 бел. руб.**
(снижена на 40 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк Белвэб», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6% от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 24.04.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35; auction@cpo.by**

**Уважаемые акционеры**
**ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»**

Решением годового общего собрания от 27.03.2025 принято решение о приобретении акций открытого акционерного общества «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» (далее – Общество), расположенного по адресу: город Слуцк, Минская область, улица Головащенко, 6 с целью последующей реализации работникам Общества.

Количество приобретаемых акций не более 1 000 штук.
Стоимость покупки – 130 рублей за одну акцию.

Оплата за акции, приобретаемые Обществом производится в безналичной форме в течение 30 календарных дней с момента подписания договора, на предоставленный расчетный счет продавца.

Договора купли-продажи будут заключаться по адресу: город Слуцк, Минская область, улица Головащенко, 6, кабинет № 202.

Срок представления акционерами предложений о продаже акций Обществу – до 01.08.2025.

Срок, в течение которого осуществляется приобретение акций с 08.08.2025 до 26.09.2025.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Слуцк, Минская обл., ул. Головащенко, 6, каб. № 202, либо по телефону 80179545328.

*Наблюдательный Совет*
*ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».*

УНП 600075003

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**15.05.2025 в 15.00**
**по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51 А,**
**проводит открытый аукцион**
ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ЖИЛОГО ДОМА
(далее – аукцион),
**расположенного по адресу: Гомельская область, Гомельский район, д. Сосновка, ул. 8 Марта, 43.**

Здание одноэтажное одноквартирного жилого дома (инвентарный номер 310/С-15874), общей площадью 57,8 кв. м (износ 60 %), фундамент – кирпичный; стены – бревенчатые, кровля – асбестоцементные листы. Год постройки – 1953 г. Сведения о регистрации земельного участка отсутствуют. Документы на дом отсутствуют.

Начальная цена пустующего дома – 1 базовая величина.

Извещение о проведении аукциона будет опубликовано на официальных сайтах Гомельского райисполкома, Государственного комитета по имуществу, а также размещено в Едином реестре пустующих домов.

Время начала приема заявлений и прилагаемых к ним документов для участия в аукционе (далее – заявления) **11.04.2025 г. с 09.00, окончание приема заявлений – 13.05.2025 в 16.00** (в рабочие дни, перерыв на обед с 13.00 до 14.00, выходной – суббота, воскресенье), место приема заявлений – Бобовичский сельисполком (Гомельская область, Гомельский район, аг. Бобовичи, ул. Пролетарская, 1А), тел.: 907438, 907439; 8 (029) 1390201.

УНП 400178403

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Смолевичское райпо, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133. УНП 600048660 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Магазин № 60 (281 кв. м,** 614/С-19020).
Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, д. Волма, ул. Смолевичская, 25**

***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. **0,1482** га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания магазина № 60. Ограничения (обременения): природ. территории, подлежащие спец. охране (зоны отдыха, водоохраны, санитар. охраны источников питьевого водоснабжения централиз. систем пит. водоснабжения)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 84 100,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 6% от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 12.05.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.05.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ООО «АСБ Лизинг» (филиал «АСБ Логистик»), 202128, Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77. УНП 601082389 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**
**Легковой универсал Ford EcoSport,**
рег. № 9257 РХ-7, 2017 г. в.
Местонахождение – Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77
**Начальная цена с НДС 20 % – 28 224,00 бел. руб.**
**Шаг торгов – 5 % от начальной цены**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 23.04.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **Государственной фельдъегерской службе** (Продавец) на праве оперативного управления.
**Электронные торги состоятся 23.04.2025.**

**Лот № 1:** ФОЛЬКСВАГЕН КЭДДИ,
кузов (рама) № WV2ZZZ2KZ7X064569.
Начальная цена без НДС – 10 360,00 руб.
Место нахождение: г. Минск, ул. К. Маркса, 16.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

ПРЫЗЫЎ-2025

# НЕ З'ЯВІЎСЯ Ў ВАЕНКАМАТ — АДКАЖАШ ПА ЗАКОНЕ

## Узнікненне падстаў для адтэрміноўкі не з'яўляецца прычынай для няяўкі на прызыўныя мерапрыемствы

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 96 ад 6 сакавіка «Аб звальненні ў запас і прызыве на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве», у сакавіку — маі 2025 года на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве прызываюцца грамадзяне Беларусі мужчынскага полу, якім да дня прызыву споўнілася 18 гадоў і якія не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву. Гэта датычыцца і грамадзян прызыўнога ўзросту, якія страцілі права на адтэрміноўку. На службу ў рэзерве прызываюцца грамадзяне з ліку студэнтаў першага курса ўстаноў вышэйшай адукацыі сельскагаспадарчага профілю, якія маюць адтэрміноўку ад прызыву для працягу адукацыі, але выказалі жаданне прайсці такую службу.

Абарона Рэспублікі Беларусь — гэта святы абавязак грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, прадугледжаны артыкулам 57 Канстытуцыі. Прызыўнікам неабходна ведаць, што парадак праходжання воінскай службы, падставы і ўмовы вызвалення ад воінскай службы або замена яе альтэрнатыўнай вызначаюцца законам.

### ПАЦВЕРДЗІЦЕ ПРЫЧЫНУ

«Так, грамадзяне, якія падлягаюць прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, у адпаведнасці з артыкулам 39 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 лістапада 1992 года № 1914-XII «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», абавязаны з'явіцца па павестках або накіраванні ваеннага камісарыята, упраўлення КДБ па вобласці або іншага органа, які ажыццяўляе воінскі ўлік, на ўсе мерапрыемствы па прызыве, у тым ліку для адпраўкі ў воінскія часці для праходжання тэрміновай ваеннай службы, службы ў рэзерве, — звяртае ўвагу **намеснік старшыні суда Першамайскага раёна горада Мінска Наталля ДЗЯДКОВА.** — А афіцэры — для атрымання прадпісання для выбыцця да месца ваеннай службы. Таксама грамадзяне, якія падлягаюць прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, абавязаны атрымаць павестку або накіраванне пад распіску».

Калі грамадзяне, якія падлягаюць прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, не з'явіліся на мерапрыемствы па прызыве па павестцы або накіраванні, яны абавязаны на працягу пяці працоўных дзён з дня заканчэння абставін, якія перашкаджалі іх яўцы на названыя мерапрыемствы, прыбыць у ваенны камісарыят, упраўленне КДБ па вобласці, у якіх стаяць на воінскім уліку. Пры гэтым неабходна прад'явіць дакументы, якія пацвярджаюць прычыну нез'яўлення.

### ШТРАФ У 150 БАЗАВЫХ

Як адзначае Наталля Дзядкова, у выпадку невыканання асобай аднаго з абавязкаў, прадугледжаных законам, яе дзеянні могуць быць кваліфікаваны па ч. 1 артыкула 435 Крымінальнага кодэкса, адказнасць па якім прадугледжвае да трох гадоў пазбаўлення волі.

«Важна разумець, што прычына не павінна быць штучна створанай, надуманай, арганізаванай па ініцыятыве выкліканай асобы, — удакладняе яна. — Напрыклад, не адносяцца да ўважлівых прычын калецтва і захворванне, якія чалавек прычыніў сабе сам альбо нехта іншы па яго ініцыятыве з мэтай ухілення ад яўкі па павестцы. Гэтыя дзеянні могуць быць кваліфікаваны па ч. 2 артыкула 435 Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць да пяці гадоў пазбаўлення волі».

Прыклад з практыкі. Малады чалавек пад подпіс быў праінфармаваны аб неабходнасці яўкі на медыцынскі агляд ва ўстаноўлены час, але да канца прызыву не прыбыў, што перашкодзіла прыняццю рашэння прызыўной камісіі аб выкананні ім воінскага абавязку. Абвінавачаны віну не прызнаў. Суду давёў, што раней яму неаднаразова давалася адтэрміноўка з прычыны наяўнасці захворвання, намеру на ўхіленне ад праходжання вайсковай службы не меў, з'явіцца па павестцы ў прызначаны дзень забыўся.

«Довады абвінавачанага аб адсутнасці намеру на ўхіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на вайсковую службу з прычыны яго стану здароўя суд прызнаў неабгрунтаванымі, — паведаміла Наталля Дзядкова. — Паводле заключэння эксперта, нягледзячы на наяўнасць у яго захворвання, малады чалавек здольны разумець сутнасць сваіх правоў і абавязкаў, а таксама здольны да ўсвядомленай і крытычнай ацэнкі таго, што здзяйсняе. Уважлівых прычын для нез'яўлення ў абвінавачанага не мелася».

Прыгаворам суда абвінавачаны быў прызнаны вінаватым ва ўхіленні ад мерапрыемстваў прызыву на воінскую службу і на падставе ч. 1 артыкула 435 Крымінальнага кодэкса яму прызначана пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры 150 базавых велічынь.

### АЖАНІЎСЯ, НАРАДЗІЛАСЯ ДЗІЦЯ — ПРАІНФАРМУЙ

Калі ў перыяд правядзення прызыўной кампаніі ўзніклі падставы для адтэрміноўкі ад прызыву (напрыклад, змянілася сямейнае становішча), то гэта не з'яўляюцца ўважлівай прычынай для няяўкі прызыўніка на мерапрыемствы прызыву.

«Законам ускладзены абавязак на грамадзян паведамляць у тыднёвы тэрмін аб змяненні свайго сямейнага становішча ў ваенны камісарыят або іншы орган, які ажыццяўляе воінскі ўлік, — тлумачыць намеснік старшыні суда. — Закон не змяшчае палажэнняў аб пераваце атрымання права на адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве перад ускладзеным на прызыўніка абавязкам удзельнічаць у мерапрыемствах прызыву. А наяўнасць падстаў для давання прызыўніку адтэрміноўкі ад прызыву ўстанаўліваецца камісіяй».

Варта адзначыць, што грамадзяне, якія маюць судзімасць, не падлягаюць прызыву. Аднак, у адпаведнасці з артыкулам 99 Крымінальнага кодэкса, пагашэнне або зняцце судзімасці анулююць прававыя наступствы крымінальнай адказнасці, а таму грамадзяне падлягаюць прызыву на агульных падставах.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЗДАВАЦЬ НА ПРАВЫ БУДЗЕМ ПА-ІНШАМУ



## Змяненні парадку прыёму экзаменаў на права кіравання транспартным сродкам пачынаюць дзейнічаць з 8 красавіка

Як адзначыў начальнік Галоўнага ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Віктар РОТЧАНКАЎ, было ўнесена некалькі змяненняў, якія ў першую чаргу накіраваны на аптымізацыю і ўдасканаленне прыёму кваліфікацыйных экзаменаў, павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых вадзіцеляў.

«Усе змяненні былі ўведзены пасля дэталёвага вывучэння таго вопыту, які мы маем пры прыёме экзаменаў. На сёння ў нас, напрыклад, тэарэтычны экзамен з першага разу здаюць каля 60 % экзаменаваных, а ўжо пасля практычнага экзамену ад 30 % да 40 % кліентаў з першага разу атрымліваюць вадзіцельскае пасведчанне. У той жа час колькасць аварый на дарогах з маладымі кіроўцамі, у якіх досвед кіравання да двух гадоў, за мінулы год вырасла прыкладна на 15 %. Гэта дарожна-транспартныя здарэнні, у якіх удзельнікі дарожнага руху атрымалі цялесныя пашкоджанні альбо загінулі», — сказаў Віктар Ротчанкаў.

Гаворка ідзе аб пастанове МУС ад 7 сакавіка, якой былі ўнесены змяненні ў гэту інструкцыю. А ўжо з сённяшняга дня экзамены будуць прымацца па абноўленым парадку. Кіраўнік ДАІ растлумачыў асноўныя новаўвядзенні: «Пры наяўнасці ў экзаменаванага вадзіцельскага пасведчання катэгорыі В, калі ён здае экзамен на катэгорыю С, практычны экзамен будзе праходзіць толькі ва ўмовах рэальнага дарожнага руху ў населеным пункце. Аўтадром у гэтым выпадку адмяняецца. Такі ж парадак прымяняецца ў выпадку, калі ў кіроўцы маецца пасведчанне катэгорыі С, але ён дадаткова здае на катэгорыю В. Бывае і так, што будучы кіроўца прайшоў навучанне адначасова на катэгорыі В і С. У гэтым выпадку чарговасць здачы на транспартных сродках, якія падпадаюць пад названыя катэгорыі, вызначае сам экзаменаваны».

Акрамя таго, практычны экзамен на права кіравання катэгорыі D прымаецца толькі ва ўмовах рэальнага дарожнага руху ў населеным пункце. «А вось ужо здача на права кіравання транспартнымі сродкамі катэгорый BE, CE і DE адбываецца толькі на аўтадроме», — падкрэсліў Віктар Ротчанкаў.

Для атрымання права кіравання пасля заканчэння тэрміну пазбаўлення правоў кіроўцы ў тых выпадках, калі асоба, у адпаведнасці з заканадаўствам, павінна зноў здаваць экзамены, яна здае іх ва ўмовах рэальнага дарожнага руху ў населеным пункце. «А «пляцоўка» адмяняецца. Пры гэтым тэарэтычны экзамен захоўваецца, — дадаў начальнік Галоўнага ўпраўлення ДАІ. — У выпадку калі кіроўца пазбаўляўся права кіравання транспартам катэгорыі С, то практычны экзамен ён будзе здаваць па той катэгорыі, якая ў яго была да пазбаўлення. Калі ж кіроўца пазбаўляўся права кіравання катэгорый А1 і А, а пасведчання на права кіравання транспартам катэгорый В або С не было, то практычны экзамен будзе выконвацца па выбары кіроўцы на транспарце катэгорыі А альбо А1».

Віктар Ротчанкаў звярнуў увагу, што на дадзены момант на аўтадроме ідзе навучанне чатыром элементам: пераадоленне ўздыму на эстакаду, заезд у бокс для пастаноўкі вучэбнага аўтамабіля на стаянку заднім ходам, заезд у бокс для пастаноўкі аўтамабіля на стаянку бокам з ужываннем задняга ходу, а таксама разварот на ўчастку пры абмежаванай шырыні праезнай часткі. «Калі раней экзаменатар вызначаў абавязковымі для здачы два элементы, то з 8 красавіка — тры. Гэта звязана з тым, што сёння пасля здачы экзамену на «пляцоўцы» вельмі вялікі працэнт няздачы ў гарадскіх умовах. Такім чынам, мы аптымізавалі працэс, і цяпер экзаменаваны будзе аднолькава падрыхтаваны для здачы як на «пляцоўцы», так і ў гарадскіх умовах», — распавёў Віктар Ротчанкаў.

Пры здачы экзамену на катэгорыі В, С і D ва ўмовах рэальнага дарожнага руху ў населеным пункце цяпер таксама будуць тры абавязковыя элементы: разварот на нерэгуляваным скрыжаванні, здзяйсненне левага павароту на скрыжаванні і рух з максімальна дазволенай хуткасцю ў патоку з захаваннем неабходнай дыстанцыі бяспекі дарожнага руху пры наяўнасці дзвюх і больш палос у адным напрамку. «Хачу адразу патлумачыць, што гэта мінімальны набор элементаў, які экзаменатар будзе ацэньваць у экзаменаванага. Ужо з'яўляліся каментарыі ў сетцы, што ацэньванне будзе адбывацца толькі па трох элементах. Гэта не так. Пры пераездзе ад аднаго элемента да іншага экзаменаваны будзе ўдзельнічаць у дарожным руху, праязджаць іншыя элементы вулічна-дарожнай сеткі: пешаходны пераход, скрыжаванне, прыпынкавыя пункты. І яго рух ад элемента да элемента будзе ацэньвацца», — заўважыў Віктар Ротчанкаў.

Таксама ў новай рэдакцыі інструкцыі строга абмежавалі час, адведзены экзаменатару на вынясенне рашэння. Здаў ці не павінны абвясціць чалавеку не пазней чым праз 5 хвілін пасля выканання ўсіх элементаў аўтадрома або завяршэння руху па маршруце ў горадзе. Экзамен у горадзе будзе здадзены, калі кіроўца дапусціў у агульнай складанасці не больш за дзве памылкі або парушэнні ПДР.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Банк торговый капитал
Закрытое акционерное общество

Наименование банка: **ЗАО «ТК Банк»**

www.tcbank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 31 марта 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 2 685 | 2 782 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 865 | 4 372 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 148 593 | 143 094 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 2 988 | 3 342 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 38 210 | 37 125 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 33 313 | 33 313 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5 468 | 5 491 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 16 904 | 17 241 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 251 026 | 246 760 |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 10 841 | 10 915 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 14 979 | 14 000 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 584 | 217 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 26 404 | 25 132 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 61 651 | 61 651 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 17 | 17 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 25 000 | 25 000 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 2 892 | 2 934 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 135 062 | 132 026 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 224 622 | 221 628 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 251 026 | 246 760 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ 31 марта 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 | 31.03.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 213 | 3 817 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 5 210 | 3 817 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 247 | 284 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 46 | 45 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 201 | 239 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 560 | 366 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 537 | (298) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 2 | 98 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 2 390 | 2 118 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | - | - |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 3 046 | 2 700 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 9 | 24 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 037 | 2 676 |

Председатель Правления С.Ф. Хайновский

Главный бухгалтер Н.А. Тиванова

Дата подписания: 2 апреля 2025 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 14.04.2023, БИК 153001333, УНП 807000163.

# ПЛАНУЕМ АДПАЧЫНАК

## Новыя напрамкі — у Беларусі і за яе межамі

Яшчэ гадоў 10-15 таму турызм пазіцыянаваў сябе як эканоміка ўражанняў. Ключавымі пры фарміраванні тураў і маршрутаў лічыліся яркія эмоцыі спажыўца, а галоўным крытэрыем поспеху — уменне ператварыць адпачынак кліента ў захапляльнае дзейства. Убачыць раней нябачанае, пакаштаваць раней некаштаванае, адчуць раней ніколі не адчутае — такім было патрабаванне. Сёння запыт турыстаў «пасталеў».

Упошнія гады адным з ключавых у сферы турызму стаў аспект гуманізацыі, адзначалі прафесіяналы індустрыі турызму і адпачынку падчас III Міжнароднага турыстычнага форуму, які прайшоў у беларускай сталіцы. Безумоўна, і запыт на яркія станоўчыя ўражанні нікуды не сышоў. Але сучасны турыст чакае ад экскурсавода, аўтара турыстычнага маршруту або нават шматдзённага туру ў тым ліку (і часта ў першую чаргу) магчымасці развіцця сваёй асобы, падкрэсліла **доктар эканамічных навук, прарэктар па развіцці праграм магістратуры і аспірантуры Расійскай міжнароднай акадэміі турызму, член Камітэта развіцця ўстойлівага турызму Расійскага саюза туріндустрыі Таццяна РАСОХІНА.** У сістэме развіцця турызму сёння з'явіўся новы элемент — і гэта аспект гуманізацыі. Сучасны турызм трансфармуе і развівае асобу, падкрэсліла эксперт. І гэта запыт не толькі дзяржаўных структур. Гэта пажаданне непасрэдных спажыўцоў. Турызм толькі ўражанняў і эмоцый застаўся ў мінулым, сёння вандроўнікі хочуць даведацца пра нешта новае, атрымліваць непаўторны інтэлектуальны і духоўны досвед. І задача людзей, што працуюць у сферы турызму, — фарміраванне такіх развіццёвых прадуктаў.

### АД МАГІЛЁВА ДА ЮПІТЭРА

Калі ад тэорыі перайсці да практыкі, то менавіта на гэты запыт — паўнавартасна адпачыць, вырвацца са звыклага «дня сурка» і пры гэтым стаць больш адукаванай і рознабаковай асобай — у першую чаргу накіраваны новыя беларускія турыстычныя прадукты. Новыя маршруты, як правіла, маюць варыянты больш працяглы і скарочаны, які дазваляе ўбачыць за пару гадзін найбольш знакавыя славутасці рэгіёна. Так, напрыклад, турыстычная праграма «Магілёў — абіцель льва» прадугледжвае альбо шэсць гадзін агляду славутасцяў аднаго з найстаражытнейшых і найпрыгажэйшых гарадоў нашай краіны, альбо пяць дзён. Першы варыянт уключае палац Каніскага (Віленскае барока), Свята-Мікольскі манастыр, сабор Успення Дзевы Марыі. За пяць дзён госці цалкам паглыбяцца ў непаўторны вайб горада, павандруюць па яго навакольлях.

Ёга-туры і рэтрыты — адзін з модных кірункаў сучаснага турызму: медытацыі, песні і мантры ў антуражы некранутай прыроды... Сёння па ўсё гэта не трэба ехаць у Індыю, можна здзейсніць этнападарожжа і ў Беларусі. Сярод новых распрацовак гомельскіх экскурсаводаў — маршрут «Этнасцежка». Экскурсія аб'ядноўвае дэндратэрапію, міфалогію, варажбу, медытацыі, чаяванне і знаёмства са старадаўнімі мясцовымі абрадамі. Навагрудак робіць стаўку на містыку, і гэта вельмі запатрабавана ў першую чаргу моладдзю. Ідэя літаральна «ляжала на паверхні», бо гісторыя гэтага горада поўная таямніц і легенд. Экскурсія «Начная містэрыя. Дамініканцы Навагрудка» распрацавана нядаўна, але ўжо паспела «абрасці» ўласнымі легендамі. Пра яе чулі нават за межамі нашай краіны.

— Госці прыязджаюць і з Сочы, і з Краснадара, — адзначае **прадстаўнік турыстычнага інфармацыйнага цэнтра Навагрудка Ульяна ВАЙТОВІЧ.** Праграма экскурсіі трымаецца ў сакрэце: інакш «будзе нецікава». Вядома толькі, што частка падзей адбываецца ў тысячагадовай крыпце, частка — пад велічныя гукі аргана.

У Навагрудку, як мы ўжо адзначалі, неверагодна прыдатная глеба для «готыкі» і «містыкі». Напрыклад, там ёсць дзве версіі цудатворнага вобраза Божай Маці (праваслаўная і каталіцкая), найстаражытнейшы ў краіне касцёл і найстаражытнейшы мужчынскі манастыр. А акрамя таго — адзіная ў свеце фігура Маці Божай цяжарнай. Баранавічы акрамя новага экскурсійнага праекта — таямнічага начнога квэсту, які арганізоўвае Музей чыгункі і які ўжо карыстаецца папулярнасцю, развіваюць гастранамічны турызм. Не, гэта не старадаўняя мясцовая кухня, а дзень сённяшні рэгіянальнай гастраноміі. «Лодачкі» з Баранавічаў вядомыя моладзі і ў іншых населеных пунктах нашай краіны. Гэта стрытфуд, нацыянальная варыяцыя хот-дога.

У Беларусі шмат населеных пунктаў з дзіўнымі назвамі: Юпітэр і Марс, Балі, Манголія і Дублін... Не так даўно было модна ездзіць па такіх вёсках, рабіць сэлфі каля дарожных паказальнікаў з гэтымі і іншымі неверагоднымі назвамі і выкладваць у Instagram. Калі не паспелі далучыцца да мэйнстрыму, самы час зрабіць гэта: Паставы запрашаюць у беларускі Парыж. У праграме маршруту «Ад Лынтуп да Парыжа. Падарожжа па Пастаўскім краі» — старадаўнія сядзібы, цэрквы і касцёлы, а таксама апошні ўстаноўлены ў Савецкім Саюзе помнік Леніну і сапраўдны беларускі вадаспад: па ім, калі хопіць духу, можна сплавіцца на байдарцы.

Яшчэ адзін трэнд сучаснага турызму — роўныя магчымасці для ўсіх. Ваўкавыск распрацаваў новы маршрут з акцэнтам на інклюзіўнасць, для людзей са слабым зрокам і слыхам. Праект сапраўды ўнікальны, першы ў нашай краіне. Распрацаваны маршрут спецыялістамі Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам. Экскурсіі праводзяцца на беларускай і рускай мовах, а таксама з дапамогай шрыфту Брайля і жэстаў.



### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома с одновременной продажей земельного участка в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение (фундамент – железобетон, площадь застройки – 0 (130) кв. м, процент готовности – 11 %) и земельный участок с кадастровым № 221288110101000144 площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Шапуры, ул. Победителей, 38. Ограничения: нет.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): 12774,99 (3474,99/9300,00) бел. руб. **Задаток:** 1 277,50 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 27,20 %.
Реквизиты для внесения задатка: р/с BY17 AKBB 3604 3141 128 562 000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300962400, код операции 40901. Получатель платежа: Октябрьский сельисполком

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 23.04.2025 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 09.04.2025 до 17.30 22.04.2025. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона**: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией права, ограничений (обременений) права на земельный участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на земельный участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества:** земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ),** которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома с одновременной продажей земельного участка в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение (фундамент – железобетон, площадь застройки – 45 кв. м, процент готовности – 12 %) и земельный участок с кадастровым № 221289210101000065 площадью 0,15 га в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Шапечинский с/с, д. Старинцы, ул. Дружбы, 2. Ограничения: нет.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **5299,45** (2734,45/2565,00) бел. руб. **Задаток**: 529,94 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 51,6 %.
**Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY74 AKBB 3604 3141 4276 7200 0000 Шапечинский сельисполком в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300958583

**Дата, время и место проведения аукциона**: **12.05.2025 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 09.04.2025 до 17.30 08.05.2025. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона**: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией права, ограничений (обременений) права на земельный участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на земельный участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества:** земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ),** которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, расходы на проведение независимой оценки по определению оценочной стоимости на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

## АД ДАГЕСТАНА ДА АМАНА

Калі ўсё ж вабяць далёкія краіны, новых цікавых напрамкаў для беларускіх турыстаў таксама дастаткова. Частка з іх, дарэчы, — добра забытае старое.

— Адпачынак у Дагестане сёння набірае папулярнасць у беларускіх турыстаў, — **распавёў памочнік кіраўніка кампаніі «Dag Tour» Марат БАЙРАМАЎ.** — З Беларусі ў сакавіку лёталі ў Дагестан два рэйсы, у красавіку іх стала тры.

Адпачынак у Дагестане — гэта пяцізоркавыя гатэлі (ёсць і больш бюджэтныя варыянты), кажа суразмоўнік. Гэта пляжны «лянівы» варыянт і горныя лыжы для тых, каму проста ляжаць на шэзлонгу сумна. Гэта шматдзённыя і аднадзённыя экскурсіі, унікальныя гістарычныя і прыродныя помнікі. Дадатковы аргумент на карысць гэтага напрамку — гастраномія.

Яшчэ адзін незаслужана забыты напрамак, які беларусы сёння адкрываюць нанова, — Узбекістан.

— Наша краіна можа прапанаваць самыя розныя віды турызму — ад аздараўленчага да экстрэмальнага, гісторыка-культурнага, падзейнага, — кажа **спецыяліст Камітэта па турызме Узбекістана Наргіс ЗІКРЫЯХАДЖАЕВА.** — Зімой папулярныя нашы гарналыжныя курорты з трасамі рознай складанасці, восенню і летам наша краіна — гэта багацце садавіны, вясной — кветкавы рай.

Хочацца забрацца яшчэ далей? Тады Аман! Краіна сёння мае прамыя авіязносіны з Мінскам. Самалёты ўзнімаюцца ў неба чатыры разы на месяц і бяруць курс на Салалу, на ўзбярэжжы Індыйскага акіяна. Грамадзянам Беларусі віза не патрэбна пры знаходжанні ў краіне 14 дзён.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ПАДЗЕЯ

# ІНВЕСТЫЦЫІ, ПРАЕКТЫ, ГАРМАНІЗАЦЫЯ ЗАКАНАДАЎСТВА

## Беларусь прымае III Беларуска-расійскі турыстычны кангрэс

**З 8 да 11 красавіка ў нашай краіне пройдзе III Беларуска-расійскі турыстычны кангрэс. І чарговы раз ён абяцае стаць адной з ключавых падзей для прафесіяналаў туріндустрыі з абедзвюх краін. Кангрэс прысвечаны актуальным пытанням узаемадзеяння Беларусі і Расіі ў сферы турызму, абмеркаванню бягучага стану спраў у турбізнесе, а таксама гарманізацыі заканадаўства і прапановах па развіцці тургаліны Саюзнай дзяржавы.**

### ДЗЕЛАВАЯ ПРАГРАМА І РЭСТАРАННАЯ ПРЭМІЯ

Сёлета праграма ахоплівае больш за 10 тэматычных секцый, уключаючы гастранамічны, аздараўленчы, прамысловы, экалагічны і аўтатурызм, а таксама пытанні інвестыцый, развіцця інфраструктуры і нарматыўна-прававога рэгулявання. Штогод мерапрыемства збірае больш за 600 удзельнікаў з Расіі і Беларусі.

У рамках кангрэса 8 красавіка запланаваны круглы стол «Гастранамічныя брэнды як сродак прасоўвання дэстынацый», а таксама ўпершыню пройдзе цырымонія ўручэння прэстыжнай рэстаранай прэміі WHERETOEAT найлепшым гастранамічным праектам Беларусі. Па выніках работы экспертнай камісіі ў Беларусі на працягу трох месяцаў апублікаваны лонг-ліст найлепшых рэстаранаў у Беларусі. У яго ўвайшлі 200 устаноў з 12 гарадоў. На цырымоніі будзе аб'яўлены ТОП-10, якія будуць уключаны ў міжнародны гід прэміі для турыстаў.

Асноўныя дзелавыя мерапрыемствы пройдуць 9 красавіка. У гэты дзень запланавана пленарнае пасяджэнне, біржа кантактаў у фармаце B2B, прэзентацыі рэгіёнаў Расіі і каля васьмі галіновых дыскусій і круглых сталоў.

Як адзначыў **старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза туріндустрыі Філіп ГУЛЫ,** звыш 90 % айчыннага тавараабароту ў турыстычнай сферы звязана з Расіяй. Кангрэс праводзіцца ўжо трэці раз, і сакрэт яго поспеху ў тым, што ён запатрабаваны бізнесам. Летась, напрыклад, з краіны-суседкі для ўдзелу прыехалі прадстаўнікі 25 расійскіх рэгіёнаў, сярод іх — Ніжагародская, Варонежская, Пензенская, Пскоўская, Калужская, Уладзімірская, Курская, Свярдлоўская вобласці, Кузбас, Башкартастан, Прыморскі край, Дагестан, Марый Эл і інш.

Адным з важных кірункаў форуму стане інвестыцыйны. Як расказаў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі Дзмітрый КАСОЎСКІ,** у агенцтве на сёння працуюць над 74 інвестпраектамі з 21 краіны з патэнцыялам інвеставання на агульную суму 0,5 мільярда долараў і стварэннем 2 тысяч працоўных месцаў. У тым ліку ў суправаджэнні і чатыры турыстычныя праекты: будаўніцтва шматфункцыянальнага гатэля ў Мінску, стварэнне СПА-комплексу, праект па палатачным гарадку і ўстаноўка ў Мінску назіральных бінокляў.

### НА САМАЛЁЦЕ — У ВОСЕМ РАСІЙСКІХ ГАРАДОЎ

Садзейнічае развіццю турыстычных напрамкаў і адкрыццё новых авіярэйсаў. Для авіякампаніі «Белавія» расійскі рынак з'яўляецца адным з ключавых. Летам яна будзе ажыццяўляць рэгулярныя рэйсы ў 10 расійскіх аэрапортаў, уключаючы тры аэрапорты Маскоўскага авіяцыйнага вузла («Шарамецьева», «Дамадзедава», «Унукава»). Акрамя гэтага, ёсць два сезонныя напрамкі — Мурманск і Махачкала. Прычым, як адзначыла **начальнік службы маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці ААТ «Авіякампанія «Белавія» Кацярына РАДЗІШЭЎСКАЯ,** яны маюць сваю спецыфіку: калі ў Махачкалу актыўна едуць беларусы для адпачынку на мора, то мурманскі рэйс, наадварот, карыстаецца папулярнасцю ў расіян, якія летам едуць на адпачынак у Беларусь. Таксама «Белавія» традыцыйна ажыццяўляе пералёты ў Санкт-Пецярбург, Казань, Калінінград, Сочы і Екацярынбург.

Апошнім часам рэйсы выконваюцца не толькі з Мінска. «Белавія» актыўна пашырае палётную праграму з абласных гарадоў. Сёння выконваюцца рэгулярныя рэйсы ў Маскву і Санкт-Пецярбург з Брэста і Гомеля. Прычым рэйс Брэст — Санкт-Пецярбург быў адкрыты зусім нядаўна, 2 красавіка. А з 28 красавіка з'явіцца новы рэгулярны рэйс Магілёў — Масква.

— Мяркуем, што тураператары будуць прапаноўваць расійскім турыстам новыя камбінаваныя турыў некалькі гарадоў, якія будуць больш зручнымі за кошт транспартнага складніка, — адзначыла Кацярына Радзішэўская.

**Алена КРАВЕЦ.**


ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Логойским сельским исполнительным комитетом (организатор аукциона) по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Гостиловичи, ул. Весенняя, 5, кадастровый номер 623284601601000381 | 0,1207 | Электрификация, водоснабжение | 23 000,00 | 2 300,00 | 2 156,56 + расходы за размещение объявления |
| 2 | д. Августово, ул. Колхозная, д. 19А, кадастровый номер 623284600201000330 | 0,1208 | Электрификация, водоснабжение, газификация | 18 000,00 | 1 800,00 | 2 282,77 + расходы за размещение объявления |
| 3 | аг. Косино, ул. Школьная, 85В, кадастровый номер 623284603201000370 | 0,1161 | Электрификация, водоснабжение, газоснабжение | 8 000 | 800,00 | 2 295,55 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона: 12 мая 2025 в 10.00 по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6,**
Логойский сельский исполнительный комитет, контактные. тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.
**Прием документов по 07.05.2025 включительно.**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах:
Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by,
Минского областного исполнительного комитета: http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/,
Логойского районного исполнительного комитета: http://www.logoysk.gov.by/

УНП 600537220



**Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества**

| № лота | Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Силосная башня для хранения цемента, 2 шт.** | **19 224,00** | **1 922,40** | **961,20** |
| 2 | **Компрессор поршневой АСО-К3/10** | **4 104,00** | **410,40** | **205,20** |

**УСЛОВИЯ**

**Аукцион состоится 21.04.2025 г. в 13.00 по адресу:** г. Минск, ул. Орловская, 40А, пом. 18.

Заявления на участие в аукционе и прилагаемые документы принимаются **с 05.04.2025 г. по 18.04.2025 г. в рабочие дни с 8.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Орловская, 40А, пом. 18.**

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты его проведения.

**Продавец:** ОАО «Гуртпромстрой».

**Организатор аукциона:** Ликвидатор ОАО «Гуртпромстрой». Месторасположение имущества: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней с даты проведения аукциона.

Задаток перечисляется на р/с BY23BAPB30123467000100000000, код BABBY2X в ОАО «Белагропромбанк», г. Слуцк, УНП 600154463. Получатель – ОАО «Гуртпромстрой». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № лота, дата аукциона). Задаток перечисляется в размере, указанном в настоящем извещении, не позднее указанного в извещении срока окончания приема документов на участие в аукционе. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Победителем признается участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других участников. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов. Результаты аукциона оглашаются публично в день проведения.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании Положения о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, представляются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством);

юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

Ознакомиться с объектом аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у организатора аукциона. Контактное лицо для осмотра объектов, тел. (029) 165 06 51.

РУПЛІВЫМ ГАСПАДАРАМ

# УЛАДАРЫ СВЯТЛА

**Кіруючы падсветкай у вырошчванні ўраджаю, часам можна дасягнуць тых жа вынікаў, што і пры ўнясенні ўгнаенняў**

Ці можна расліны вырошчваць у замкнёных прасторах, напрыклад, у космасе? Як з дапамогай святла кіраваць раслінным светам? Што трэба ўлічыць, каб атрымаць добрую расаду? З такімі пытаннямі я звярнулася да вучоных Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук.

«Расліны — гэта фотатрофныя арганізмы. Святло для іх — і крыніца інфармацыі аб навакольным асяроддзі, і сілкаванне. Рэгулюючы яго, мы можам мэтанакіравана ўздзейнічаць на расліны: стымуляваць назапашванне вегетатыўнай масы, цвіценне, паскараць фарміраванне пладоў, мяняць біяхімічны састаў у лістах і пладах. І ўсё гэта экалагічна бяспечна. Часам толькі кіруючы святлом, можна дасягнуць вынікаў, якія чалавек хоча ўбачыць пасля ўнясення пэўных прэпаратаў», — заўважае **загадчыца лабараторыі біяфатонікі і стрэсаўстойлівасці раслін Вольга МОЛЧАН.**

Сярод кірункаў, над якімі сёння працуюць вучоныя, — распрацоўкі святлодыёднага асвятлення для цяпліц. Да вучоных Інстытута эксперыментальнай батанікі звяртаюцца вытворцы, каб праверыць якасць свяцільнікаў, зразумець, як іх можна ўдасканаліць, высветліць, наколькі яны падыходзяць для вырошчвання пэўных раслін. У лабараторыі вывучаецца ўплыў розных спектральных рэжымаў, рэгламентаў і падыходаў да асвятлення, у тым ліку і ва ўмовах, дзе святло адсутнічае наогул і адзінай крыніцай для яго становяцца святлодыёды.

## ЯК СЭКАНОМІЦЬ НА АТРЫМАННІ ЎРАДЖАЮ?

Сёння важна вырашаць задачы, звязаныя з эканоміяй электраэнергіі, утанненнем вытворчасці агароднінай прадукцыі. Святлодыёды — адзін з асноўных інструментаў, які дазваляе гэта зрабіць. Вучоныя Інстытута эксперыментальнай батанікі разам з Цэнтрам святлодыёдных і оптаэлектронных тэхналогій НАН, які распрацоўваў лямпы, працавалі над эксперыментальнай праграмай для Мінскай агароднінай фабрыкі. Разам з работнікамі сачылі за ростам раслін і здымалі ўраджай.

Святлодыёды выкарыстоўваюцца часцей пры пабудове новых комплексаў. Справа ў тым, што раней «агароды за шклом» распрацоўваліся пад іншае асвятленне. Цяплічная тэхналогія адразу ішла «пад ключ», дзе ўсе нюансы ўвязаны паміж сабой, у тым ліку асвятленне, памер цяпліцы і нават лесвіцы, з дапамогай якой супрацоўнікі будуць збіраць ураджай. Для дасвечвання прынята было выкарыстоўваць натрыевыя лямпы. Яны добра сябе зарэкамендавалі. Але такая лямпа дае вялікую колькасць цяпла, блізка да раслін яе падвесіць нельга, каб яна іх не спаліла. Адпаведна пад яе патрэбна вялікая цяпліца. Святлодыёды цяпла не даюць, іх цяжка «ўпісаць» у тэхналогію, якая ўжо існуе. Дзякуючы таму, што іх можна нізка павесіць над раслінамі, варта паменшыць памеры цяпліц, перайсці на стэлажнае, вертыкальнае вырошчванне, калі на невялікай плошчы размяшчаецца некалькі ярусаў з раслінамі. Вядома, каб перастроіцца, патрэбны распрацоўкі новых тэхналогій, і вучоныя

гатовыя прапанаваць навуковае суправаджэнне пры выкарыстанні святлодыёднага асвятлення».

## ГАЙ НА ДАЛОНІ І «БЕЛАРУСКІЯ ТРОПІКІ»

«Святлодыёды дазваляюць стварыць індывідуальны спектр. Мы маем унікальную ўстаноўку, якая дазваляе вар'іраваць сілу току і стварацца святло абсалютна любога спектра. А яно можа быць рознае: чырвонае, зялёнае, сіняе, блакітнае, жоўтае , — Вольга Молчан паказвае, як у лабараторыі ў замкнёных умовах даследуюцца розныя спектры. — Падбіраючы святло, мы можам сказаць, якое пэўнай расліне неабходна, напрыклад, для таго, каб квітнець. Даследуюць вучоныя і ўплыў інтэнсіўнасці асвятлення».

Цяпер вядуцца даследаванні па вывучэнні ўплыву інтэнсіўнасці святла і спектральнага саставу на назапашванне біялагічна актыўных рэчываў. Напрыклад, каб базілік не толькі вырас, але і назапасіў больш карысных рэчываў, трэба для яго стварыць пэўныя ўмовы. Рэгулюючы святло, можна забяспечыць назапашванне антацыянаў, флаваноідаў, бялку і іншых рэчываў. У лабараторыі мне паказалі адну з самых дарагіх лекавых раслін у свеце — катарантус ружовы. Яна назапашвае індольныя алкалоіды, якія выкарыстоўваюць у хіміятэрапіі пры захворванні на анкалогію. Плантацыі такіх трапічных раслін можна пабачыць у Індыі, але іх можна будзе вырошчваць і ў нас — у памяшканні. Цяпер вучоныя даследуюць уплыў святла на накапленне катарантусам алкалоідаў.

Вы калі-небудзь трымалі ў руках бярозавы гай? У лабараторыі пад лямпамі стаяць шклянкі, у кожнай з якіх — шмат дробных раслін. Гэта культура інвітра. Сёння такая тэхналогія дазваляе хутка размнажаць саджанцы, напрыклад, для лесааднаўлення. Але для мікракланальнага размнажэння ствараюцца асаблівыя ўмовы.

З такога камфортнага «дзіцячага садка» гэтых малых у адкрыты грунт адразу не высадзіш. Святлом можна рэгуляваць святлоўстойлівасць, стварыць фенатып, калі пры перасадцы ў прыродныя ўмовы расліна зможа лёгка прыжыцца і хутка расці.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## У тэму

### ПЯЦЬ ПЫТАННЯЎ АД ДАЧНІКАЎ

***— Апошнім часам паміж агароднікамі ўсё больш спрэчак наконт фіталямп для расады? Якога колеру святло яны павінны даваць?***

— Пры вырошчванні расады не хапае пераважна не нейкіх частак спектра, а агульнага патоку асвятлення, інтэнсіўнасці, што звязана з кароткім днём і лакалізацыяй кватэры, напрыклад, калі вокны выходзяць на паўночны бок. За суткі расліна ў пэўны перыяд павінна атрымаць пэўную дозу святла. Першыя фіталямпы, якія набывалі гаспадыні, былі чырвона-сіняга спектра. Інтэнсіўнасць такіх лямп была нізкая, хаця, бясспрэчна, яны лепшыя, чым нічога, але дабавіць дозу фіталямпа расліне не магла. Яна толькі крыху паляпшала агульны спектр. Звычайная лямпа для асвятлення памяшкання дае больш святла, і расліны пад ёй лепш растуць. Што датычыцца чырвонага святла, яно стымулюе фотасінтэз, але дачніку, калі ён вырошчвае расаду, важней, каб расліна не выцягвалася, сцябло было больш кароткае, тоўстае. Тут лепш сіняе святло, і менавіта пад звычайнай белай «лямпай» яго больш.

***— Якія лямпы найбольш прыдатныя?***

— Адназначна я б раіла святлодыёды. Яны эканамічныя, зручныя, іх можна размяшчаць над раслінай. Калі якасныя, маюць вялікі тэрмін службы — могуць працаваць ад 30 тысяч гадзін. Яны пажарабяспечныя, тут няма ртуці, як, напрыклад, у люмінесцэнтных лямпах.

***— Ці трэба свяцільнікі ўключаць днём?***

— Калі вокны выходзяць на поўдзень і ў іх свеціць сонца, не трэба. Іншая справа, калі пахмурнае надвор'е альбо калі вокны выходзяць на сцяну суседняга дома і прамяні сюды не трапляюць наогул.

***— Ці праўда, што ўсходы першыя 2–3 дні трэба трымаць пры асвятленні 24 гадзіны на суткі?***

— Расліны — як дзеці малыя. З самага пачатку ім важна фарміраваць устойлівыя фенатыпы. Важна стварыць імітацыю натуральных умоў. 16 светлых гадзін у дзень і 8 у ноч — і ўсё будзе добра расці. Зменай фотаперыяду лепш за ўсё рэгулюецца квітненне. У цяплiцах, калі вырошчваюць таматы, напрыклад, ноч могуць рабіць і па 5-6 гадзін, для таго каб паскорыць атрыманне пладоў, квітненне, інтэнсіфікаваць фотасінтэз, каб цукры назапашваліся.

***— Як падрыхтаваць расаду да высадкі ў грунт?***

— У маі ўжо позна будзе гэта рабіць. Трэба пачынаць цяпер. Каб расліна была ўстойлівай і лёгка перанесла пераезд, яна павінна быць кампактная, мець моцнае сцябло, малыя міжвузеллі. Калі расліна выцягваецца, гэта значыць, што ёй мала святла. Забяспечце яго высокую інтэнсіўнасць любым спосабам. Не трэба бегчы па «лекі»: стымулятары росту, амінакіслоты. Такія прэпараты я б не раіла бессістэмна выпрабоўваць на расадзе, у вялікіх дозах яны могуць нават інгібіраваць рост. Іх трэба выкарыстоўваць у пераломныя моманты жыцця раслін. Напрыклад, калі трэба абараняць ад хвароб ці пры чаранкаванні. Але цалкам на падкормках сэканоміць не атрымаецца, таму што большая частка грунтоў, якія прадаюцца, не забяспечаць расліны той колькасцю мінеральных элементаў, якія ім патрэбны для росту. Важна забяспечыць іх азотам, фосфарам, каліем.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (Организатор аукциона) по поручению **ОАО «Смолевичский райагросервис»** (Продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1:** открытая площадка для хранения металла с инв. № 614/С-26097, общей площадью 4395,5 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 624884507601000196 *(право постоянного пользования)*, площадью 0,8486 га, по адресу: Минская область, Смолевичский район, Плисский с/с, п. Черницкий.

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В, пл. 0,06275 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **194 400,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **19 440,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 25 %.**

**Лот № 2:** здание автогаража с инв. № 614/С-26095, общей площадью 422,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624884507601000219 (право аренды по 09.10.2053), площадью 0,1836 га, по адресу: Минская область, Смолевичский район, Плисский с/с, п. Черницкий, ул. Черницкая, 16А и электроталь Н12 0,5 т (инв. № по бух. учету 6541К3).

Начальная цена с НДС (20 %) – 61 875,00 бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 6 187,00 бел. руб.
Стоимость снижена на 25 %.

**Лот № 3:** здание механического цеха с инв. № 614/С-26092, общей площадью 4492,3 кв. м, здание материального цеха с инв. № 614/С-31821, общей площадью 246 кв. м, здание проходной с инв. № 614/С-26096, общей площадью 14,8 кв. м, ограждение с инв. № 614/С-31825 общей площадью 530,2 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 624884507601000103 (право постоянного пользования), площадью 2,9341 га, по адресу: Минская область, Смолевичский район, Плисский с/с, п. Черницкий, а также котёл стальной твердотопливный КСТБ-95 с оборудованием (инв. № 1000105К3), кран консольно-поворотный (инв. № 6377К3), кран козловой К-09 (инв. № 6311К3), кран подвесной 2 т (инв. № 6577К3), кран подвесной 3 т (инв. № 6317К3), кран подвесной 3 т (инв. № 6318К3), кран подвесной 3 т (инв. № 6319К3), монорельс 1 т (инв. № 6314К3), монорельс св. (инв. № 6305К3), теплосчетчик 02-03 (инв. № 7034К3), трансформатор ТКГ-400 (инв. № 1847К3), трансформатор ТСМ (инв. № 1384К3), электроталь 1 т (инв. № 6308К3), электроталь НРБ (инв. № 6569), кран подвесной 5 т (инв. № 2735).

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624884507601000103** *(право постоянного пользования)*, площадью 2,9341 га, по адресу: Минская область, Смолевичский район, Плисский с/с, п. Черницкий.

Начальная цена с НДС (20 %) – **804 897,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **80 489,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 25 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов, а также оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 7 (семи) процентов, по лоту № 3 – 2 (двух) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 20.04.2024, 16.07.2024, 15.10.2024, 14.02.2025.

Аукцион состоится **22.04.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.04.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64; 8 (029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (029) 145-17-40.**

ПРЭМ'ЕРА

# МІСТЫКА І ГАЛУБЫ

## Пермскі рэжысёр Сяргей Фядотаў у Мінску зазірнуў у мінулае

«...Іду па калідорах будынка тэатра імя Янкі Купалы, разглядаю партрэты на сценах. Раптам бачу: нехта вельмі падобны на майго дзеда... Аказалася, гэта Янка Купала», — так рэжысёр Сяргей Фядотаў пастараўся выказаць прыязнасць да нашай краіны перад прэм'ерай сваёй пастаноўкі «Каханне і галубы» ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры.

Рэжысёр прыязджаў у Беларусь у межах гастроляў яго аўтарскага тэатра «У Моста» з апакаліптычным спектаклем «Звер» (гэты калектыў скіраваны ў містыку і псіхалагізм, яго адметныя пастаноўкі былі адзначаны прэстыжнай расійскай прэміяй «Залатая маска»). І якраз гэтымі днямі ў Фядотава адбылася прэм'ера з беларускім калектывам. То-бок, былі сур'ёзныя падставы для чаканняў. Тым больш што да пастаноўкі ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры абралі п'есу Уладзіміра Гуркіна «Каханне і галубы».

І галубы на сцэне ёсць! Сапраўдныя, у клетцы. Вядома ж, тэатр — жывое мастацтва. Усё павінна быць як у рэальнасці, асабліва калі гісторыя жыццёвая.

А яна шырока вядомая з моманту выхаду папулярнага фільма Уладзіміра Мяньшова. Праўда, насамрэч за некалькі гадоў да таго п'еса Гуркіна была ўвасоблена ў тэатры — на сцэне легендарнага «Сучасніка». І пасля тэатры звярталіся да гісторыі сям'і Кузякіных — лірычная камедыя, як правіла, знаходзіла гледачоў, асабліва ў антрэпрызах: зразумелы сюжэт, простыя героі, толькі на піку эмоцый, выкліканых асабістай драмай.

Шчыра прызнаюся, што ніколі не разумела, чаму гэтыя героі выклікаюць такую цікавасць і замілаванне: інфантыльны мужчынка, які траціць грошы на галубоў, калі жонка цягне сям'ю і гаспадарку (не дзіва, што сварыцца з ім), ды дзед-п'янтос, які толькі і шукае магчымасці «ўзрадавацца» цішком ад кабеты, каб не выкрыла. А дзеці Кузякіных разам з маці кідаюцца ў істэрыкі, калі даведваюцца пра здраду бацькі на курорце... Але сутнасць у пакаяльным вяртанні і дараванні — павучальны «хэпі-энд». На які, напэўна, можна глядзець бясконца: мужчынам — з думкай пра дараванне, жанчынам — з адчуваннем трыумфу.

Але ў чым мэта гэтай пастаноўкі цяпер? З аднаго боку, каб тэатру было добра, асабліва працуючы ў новых фінансавых умовах: трэба прыцягнуць гледача нейкімі «хітамі». «Народная камедыя» (так называлі «Каханне і галубы»), вядомая праз кіно — нібыта знаходка. Тыя, хто бачыў фільм, як мінімум захочуць паглядзець: а хто ў ролі Васіля, якога ўвасабляў вядомы савецкі акцёр Аляксандр Міхайлаў? Хто сыграе кінутую жонку Надзею так жа арганічна, як Ніна Дарошына? А ў каго атрымаецца перадаць характар разлучніцы Раісы Захараўны так жа пераканаўча, як у зоркі Людмілы Гурчанка?.. Тыпажы каларытныя, і нашы акцёры ў нечым ідуць за кіназоркамі (бо абстрагавацца цалкам складана), але стараюцца дадаць штосьці ад сябе. Напрыклад, Дзяніс Майсейчык — зусім іншы Васіль, больш стрыманы і нерашучы. У той час як Віялета Сарвірава паказала, як уся энергія Надзеі, што растрачвалася на клопаты пра блізкіх, раптам трансфармуецца ў канцэнтраваны выбух роспачы. Раіса Захараўна ў выкананні Наталлі Дуванавай — наогул «кісейная паненка», заклапочаная асабістай пачуццёвасцю (і навошта ёй трэба было ехаць у вёску да сям'і Васіля?..) Ёсць яшчэ няўрымслівая парачка: дзядзька Міця і баба Шура — артысты Аляксандр Шараў і Наталля Анішчанка (а некаторыя згадаюць Сяргея Юрскага і Наталлю Ценякову).

Але знойдзецца вялікая частка патэнцыяльных тэатральных гледачоў, якія наогул не ведаюць фільм. Таму, з другога боку, спектаклем могуць зацікавіцца гледачы, якія хочуць простага расповеду чалавечага сюжэта, зразумелага, без мудрагелістасцяў. Сяргей Фядотаў як рэжысёр так і зрабіў. На сцэне мы бачым вясковы двор з хатай. Чуем музыку — «хіты» савецкіх часоў. Але разумеем, што нас не адпраўляюць у мінулае, бо гэта толькі антураж: імёны герояў могуць быць зменены, але падобных асоб мы можам бачыць вакол сябе...Сваю ролю адыгрываюць і крылатыя фразы, якія пайшлі ў народ. Хто хоць бы раз у жыцці не чуў: «Гэта мой натуральны колер». Як у нас кажуць: і смех, і грэх...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества должника

Электронные торги состоятся **23.04.2025 в 11.00.**

**Лот № 1: Механическая мастерская с котельной с инв. № 600/С-97057.**

Площадь – 596,8 кв. м. Назначение: здание нежилое.

Адрес: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 68/1, район д. Лесковка.

Обременение:

1. Ипотека. 2. Запрет на совершение регистрационных действий. 3. Арест. 4. Аренда.

Идентификационные сведения о правообладателе:

открытое акционерное общество «МИНСКВОДСТРОЙ».

Начальная цена продажи – 622 080,00 руб. Задаток – 62 208,00 руб.

Земельный участок 623680600001000039 площадью 2,1006 га.

Целевое назначение: для обслуживания производственной базы.

Право постоянного пользования.

Обременение: запрет на совершение регистрационных действий.

На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги.

Шаг электронных торгов – 5 %.

1. Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласный приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку) – обязан оплатить полную стоимость приобретенного на электронных торгах Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен по согласованию с уполномоченным органом, но не более чем на 20 рабочих дней.

2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

3. Переход права собственности на приобретённый на электронных торгах Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.

Организация и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе порядке их проведения, об оформлении участия в них размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB3012780 2900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **18.04.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (10 %), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1787 | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-23061 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание водогрейной, общая площадь – 20,9 кв. м, составные части и принадлежности – благоустройство) | 10368,00 | 1036,80 | 518,40 |
| В отношении лота № 1787 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 43 (30431) от 04.03.2025 | | | | |
| **Местонахождение лота № 1787:** Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3Д | | | | |
| Лот № 1787 расположен на земельном участке с кадастровым номером 123450100001004339, площадь 0,6501 га, целевое назначение – для обслуживания здания «Здание водогрейное». Право постоянного пользования. Ограничения (обременения): земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 0,0180 га | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **21 апреля 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 08 апреля 2025 года до 16.00 17 апреля 2025 года** | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту 1787, ООО «Профитсистем», проводимых 21.04.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения торгов. **Вознаграждение аукциониста: 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 5295202 Сергей (пн – пт с 10.00 до 13.00).**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (17) 3958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

СПОРТ-ТАЙМ

# АНТОН СМОЛЬСКІ ПАСТАВІЎ ПРЫГОЖУЮ КРОПКУ Ў БІЯТЛОННЫМ СЕЗОНЕ

## У аглядзе «Звязды» — выдатныя спартыўныя навіны

**ТРЫУМФ ТЫДНЯ.** Хакеісты мінскага «Дынама» ўпершыню ў гісторыі клуба прабіліся ў другі раўнд плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі. У першым раўндзе плэй-оф сезона-2024/2025 мінчане сустракаліся з маскоўскім ЦСКА. Вынік серыі — 4:2 на карысць «зуброў». Сапернікам мінскіх хакеістаў у другім раўндзе стане чалябінскі «Трактар».

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Беларус Іван Літвіновіч заваяваў «золата» на другім этапе Кубка свету па скачках на батуце 2025 года, які прайшоў у Італіі. Выступленне двухразовага алімпійскага чэмпіёна суддзі ацанілі на 66,930 бала. На папярэднім этапе Кубка свету ў Баку Літвіновіч таксама атрымаў перамогу.

**ГЕРОЙ ТЫДНЯ.** Антон Смольскі другі раз у кар'еры стаў пераможцам агульнага заліку Кубка Садружнасці па біятлоне. У гэтым сезоне лідар беларускай зборнай перамагаў сем разоў: тры разы на першым этапе Кубка Садружнасці ў Краснаярску, адзін раз на чацвёртым этапе ў Дзэміне і тры разы на дамашнім этапе ў Раўбічах. У асабістых гонках Кубка Садружнасці — 24/25 у Антона Смольскага два сярэбраныя медалі і яшчэ тры трапленні ў шасцёрку наймацнейшых.

Апошні этап Кубка Садружнасці, які прайшоў у Мурманску, для беларускіх біятланістаў выдаўся нядрэнным. У новай дысцыпліне, адзіночнай эстафеце, тандэм Антона Смольскага і Паўла Бялько заняў трэцяе месца. У жаночай частцы гэтай дысцыпліны Дзінара Смольская і Ксенія Варабей занялі другое месца. На старт жаночага спрынту выйшлі 24 біятланісткі. Дзінара Смольская да фінішу прыехала першай, Ганна Сола — трэцяй.

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Гандбалісткі «БНТУ-БелАЗа» 18-ы раз сталі ўладальніцамі Кубка Беларусі сярод жаночых каманд. У вырашальным паядынку дзяўчаты перамаглі саперніц з «Гомеля» — 32:25. У матчы за «бронзу» кубкавага розыгрышу брэсцкае «Бярэсце» адолела гродзенскую «Гараднічанку» з перавагай у два галы — 27:25.

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** У Брэсце завяршыўся адкрыты чэмпіянат Беларусі па плаванні. На турніры выступілі больш за 300 плыўцоў з Беларусі і Расіі, у тым ліку ўсе лідары нашай нацыянальнай каманды. Анастасія Шкурдай заваявала пяць асабістых узнагарод: яна выйграла тры дыстанцыі на спіне (50 м, 100 м і 200 м), была наймацнейшай на паўсотні кролем і ўзяла «серабро» на 50-метроўцы батэрфляем. Чатырохразовай чэмпіёнкай краіны 2025 года стала і Аліна Змушко: яна тры разы перамагла ў брасе і на дыстанцыі 200 метраў комплексам. У мужчын абсалютным чэмпіёнам у плаванні на спіне стаў Уладзімір Мамекін, у плаванні брасам — Ілья Шымановіч.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

НАДВОР'Е

# ТЫДЗЕНЬ СА СНЕГАМ І МАРАЗАМІ,

## але да выхадных пацяплее да плюс 18

**Арктычны вецер прынёс на нашу тэрыторыю сапраўдную зіму. А пераважна па ўсходняй палове краіны назіраецца снежнае покрыва вышынёй 1—14 сантыметраў. У многіх раёнах Магілёўскай вобласці вышыня снежнага покрыва дасягае 23—27 сантыметраў. Сярэдняя тэмпература паветра ніжэйшая за кліматычную норму на 4—9 °С, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак надвор'е ў нашай краіне будзе вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску і няўстойлівая халодная паветраная маса. У многіх раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, месцамі чакаецца слабая завіруха. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні, паўночны ўмераны, удзень парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да мінус 9 °С, пры праясненнях да мінус 11 °С, у заходніх раёнах краіны яна складзе ад нуля да мінус 2 °С. Максімальная тэмпература днём будзе таксама не радаваць — ад мінус 1 °С па ўсходзе да плюс 6 °С па захадзе Беларусі.

У сераду ноччу месцамі пройдзе невялікі снег, днём на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны, удзень з пераходам на заходні ўмераны, часам парывісты, месцамі на паўночным захадзе моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад мінус 2 °С па захадзе да мінус 10 °С па ўсходзе краіны, пры праясненнях да мінус 12 °С. Днём да плюс 1— 8 °С.

У чацвер у асобных раёнах краіны прагназуюцца мяцеліца, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні, паўночны парывісты, у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад мінус 1 да мінус 6 °С, а максімальная днём ад мінус 2 да плюс 5 °С.

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны таксама пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах могуць быць слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад плюс 1 па захадзе да мінус 12 °С па ўсходзе, максімальная днём — мінус 1 — плюс 6 °С, па захадзе — да плюс 9 °С.

Паводле папярэдніх прагнозаў, ужо ў выхадныя да нас накіруюцца цёплыя паветраныя масы. Тэмпературны фон будзе павышацца, а ў ападках — мокры снег і дождж. У суботу ноччу — ад мінус 6 °С па поўначы да плюс 3°С па паўднёвым захадзе, днём — ад плюс 1°С па ўсходзе да плюс 12 °С па захадзе.

У нядзелю ўначы месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). Удзень будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах верагодныя слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 4 па ўсходзе да плюс 6 °С па захадзе, максімальная днём — ад плюс 7 па ўсходзе да плюс 18 °С па паўднёвым захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## 8 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1918** год — утворана Заходняя ваенная акруга — ваенна-адміністрацыйнае аб'яднанне воінскіх частак, злучэнняў, ваенных вучэбных і іншых устаноў, якія дыслацыраваліся ў асноўным на Беларусі.

**1931** год — у калгасе «Чырвоная Поласчына» Ушацкага раёна выйшаў 1-ы нумар газеты «Ударнік» — адной з першых у БССР сельскіх шматтыражных газет.

**1956** год — адкрыццё Беларускага дзяржаўнага тэатра юнага гледача.

У свеце

**563** год да н. э. — нарадзіўся Сідхартха Гаўтама, індыйскі мудрэц і настаўнік, легендарны заснавальнік будызму. Вядомы таксама пад імем Шак'ямуні («Мудрэц з роду Шак'яў»), з'яўляецца галоўнай фігурай у будызме, і аповеды пра яго жыццё, пра дыскурсы, манаскія правілы, якіх цяпер прытрымліваюцца будысты, былі абагульнены пасля яго смерці і захаваныя яго паслядоўнікамі. Ён таксама лічыцца богам альбо прарокам у іншых сусветных рэлігіях ці канфесіях, як індуізм, ахмадыя і веры багаі.

**1336** год — дата нараджэння Цімура (Тамерлана), палкаводца, эміра, стваральніка дзяржавы са сталіцай у Самаркандзе. Разграміў Залатую Арду, здзяйсняў заваёўныя паходы ў Іран, Закаўказзе, Індыю, Малую Азію.

**1525** год — вялікі магістр Тэўтонскага ордэна Альбрэхт Брадэнбургскі, перайшоўшы ў пратэстанцызм, па парадзе Марціна Лютэра секулярызаваў землі Тэўтонскага ордэна ў Прусіі, ператварыўшы іх у свецкае герцагства.

**1946** год — у Жэневе прайшло апошняе пасяджэнне Лігі нацый. Арганізацыя перадала свае паўнамоцтвы ААН.

**1986** год — Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў падчас візіту ў Тальяці ўпершыню ўжыў слова «перабудова».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000000767 ад 30.04.2004. 220013. Мінск. праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 279. Індэкс 63850. Зак. № 781.

Нумар падпісаны ў 19.30

7 красавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12